**Беларуская Каталіцкая Уніяцкая Царква**
**Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла ў Лёндане**

ВЯЧЭРНЯ І ЛІТУРГІЯ

# СЛУЖБЫ ПЯТАГА І ШОСТАГА ТЫДНЯЎ ВЯЛІКАГА ПОСТУ

– – – – –

# ВЕРБНІЦА

**Лёндан 1993**

**Службы Пятага і Шостага Тыдняў Вялікага Посту**
Пераклад на беларускую мову а. Аляксандра Надсона
©Выдавецтва "Божым шляхам" 1993
Marian House, Holden Avenue, London N12 8HY,
England

# НЯДЗЕЛЯ ЧАЦЬВЕРТАЯ ВЯЛІКАГА ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..":** *чатыры песьні актойху належнага тону, пасьля наступныя:*

*Песьні Трыядзі (тон 3).* Пакажам, верныя, вялікія стараньні ва ўстры- манасьці часова, каб асягнуць вечную славу і, ласкаю вялікага Бога, быць збаўленымі ад пякельнага агню.

Перайшоўшы палову посту, пакажам, верныя, пачаткі Боскага жыцьця, стараючыся дасягнуць мэты праведнікаў і атрымаць непрамінальную радасьць.

(*Тон 7*). Ужо мінула палова сьвятога посту; дык пасьпяшым радасна да Таго, хто чакае нас, памазаўшы душы аліваю дабрадзейнасьцяў, каб нам удастоіцца бачыць Боскія мукі Хрыста Бога нашага, і дасягнуць слаўнага і сьвятога ўваскрасеньня.

*Тры песьні і багародзічны з мінеі*

**Вершапесьні**

(*Тон 7*). Блізка ўжо Госпад, які насадзіў вінаграднік і паклікаў работнікаў. Прыйдзіце, працаўнікі посту, атрымаць узнагароду, бо гаспадар багаты і міласэрны: нават калі мы і мала папрацавалі, атрымаем душэўную міласьць.

(*Тон 6*). Адам, паддаўшыся разбойніцкай задуме, спакусіўся розумам, скалечыў душу і голы ляжаў, ня маючы заступніка: сьвятар старазаконны не пачуў яго, і лявіт на яго ня глянуў. Толькі Ты, Божа, які прыйшоў не з Самарыі, але ад Багародзіцы нарадзіўся. Госпадзе, слава Табе.

(*Тон 8*). Мучанікі Гасподнія, вы асьвячаеце кожнае месца, і лечыце ўсе немачы. Маліцеся цяпер, просім вас, каб нашым душам вызваліцца ад сеці ворага.

Слава ...цяпер ...

(*Тон 8*). Нябесныя сілы пяюць хвалу табе, поўная ласкі Дзева Маці, і мы таксама славім нязьведанае тваё сынараджэньне. Маліся, Багародзіца, за збаўленьне душ нашых.

## ПАНЯДЗЕЛАК ПЯТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

**(Тон 3).** Ты, Божае Слова, што даў нам час посту, каб навярнуцца і быць жывымі, а не згінуць, зрабі нас дастойнымі рабіць прыемнае Табе, і ў шчырым каяньні паслужыць Табе, Хрысьце, як тая чыстая і пачэсная блудніца, што алеем духмяным і гарачымі сьлязамі заслужыла адпушчэньне правін.

Быццам сьляпы клічу з глыбіні сэрца: "Сыне Божы, прасьвятлі вочы сэрца майго"; і як верная хананейка ўсклікаю Табе: "Зьмілуйся нада мною, Добры! Маю душу, што бесіцца ў асалодах жыцьцёвых; Ты ж, вывеўшы яе з цемры пажаданьняў, учыні чыстым рэшту жыцьця майго, каб мне славіць велiч міласэрнасьці Тваёй"

(*Тон 8*). Боская сьветлая ласка ўстрыманасьці, зазьзяўшы нам сёньня ясьней за сонца, прасьвятляе душы нашы, і адганяе цемру грэшных пажаданьняў. Дзеля гэтага прыйдзем усе і, радасна стаўшы на боскі шлях поснага подзьвігу, умацаваныя ім, усклікнем Хрысту: "Асьвяці, Добры, тых, што яго верна выконваюць."

*Тры песьні і багародзічны з мінеі.*

*Пракімен (Пс 85).* Настаў мяне, Госпадзе, на шлях Твой, і я буду хадзіць у праўдзе Тваёй.

Прыхілі, Госпадзе, вуха Тваё.

**Чытаньне кнігі Быцьця (*13:12-18*)**

Аўрам пасяліўся на зямлі Хананейскай; а Лот застаўся ў суседняй краіне, пасяліўшыся ў Садоме. Жыхары Садому былі благія, вельмі грэшныя перад Госпадам. Пасьля таго, як Лот адышоў, Госпад сказаў Аўраму: "Глянь перад сабою, зірні з гэтага месца, дзе стаіш, на поўнач і на поўдзень, на ўсход і да мора; усю гэтую краіну, якую бачыш, даю табе і тваім нашчадкам давеку. І тваіх нашчадкаў учыню так шматлікімі, як пясок зямны; калі хто зможа зьлічыць зёрны пяску зямнога, той палічыць і нашчадкаў тваіх. Устань і перайдзі гэтую краіну ўздоўж і ўшырыню: аддаю яе табе і тваім нашчадкам давеку." І пайшоў Аўрам і прыйшоў пад Гэброн, і пасяліўся ля дуба Мамбрыйскага; і зрабіў там ахвярнік Госпаду.

*Пракімен (Пс 86).* Госпад любіць вароты Сыёну больш за ўсе сялібы Якуба.

Асновы Яго на горах Сьвятых.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*14:27-15:4*)

Крыніца жыцьця — Старх Гасподні, што дае нам пазбегнуць сеці сьмерці. Хвала цара — вялікі народ; у нястачы людзей руіна ўладара. Цярплівы мае вялікі розум; хуткі на гнеў паказвае дурасьць сваю. Лагоднае сэрца — жыцьцё для цела, зайздрасьць косьці грызе. Хто прыгнятае ўбогага, зьневажае Тварца; шануе Яго той, хто шкадуе беднага. Злога валіць на зямлю ягоная ўласная злосьць; праведнік у сумленнасьці сваёй знойдзе прытулак. У сэрцы разумнага мудрасьць жыве; ярод дурняў яе не відаць.. Справядлівасьць падносіць угору народ; грэх — сорам народаў. Уладар прыхільны разумнаму слузе; гнеў ягоны на несумленнага. Лагодны адказ суцішае гнеў; дражлівае слова выкікае лютасьць. Язык мудры дае навучаньне; вусны дурных мелюць бязглуздзіцу. Вочы Госпада на кожным месцы: яны сочаць за злымі і добрымі. Лагодны язык — дрэва жыцьця: хто захоўвае яго, напоўніцца духам.

**Вершапесьні**

(*Тон 7*). Быццам той, хто папаўся ў рукі разбойнікаў і быў паранены імі, так і я ўпаў у грахі многія і пакалечыў душу маю. Да каго ўцяку, вінаватыЬ Хіба толькі да Цябе, дабрасардэчнага Лекара душ: вылій на мяне, Божа, веліч зьмілаваньня Твайго.

(*Тон 4*). Першым грахом мы былі пазбаўленыя райскай асалоды і асуджаныя на ганебнае жыцьцё і, быццам папаўшыся ў рукі разбойнікаў, правінамі сваімі мы абакрадзеныя з дабрадзейнасьцяў і гонару; ляжым напоўмёртвыя, правініўшыся супроць збавенных навучаньняў Тваіх. Але молім Цябе, Уладару, які зьявіўся ад Марыі і які, будучы непадуладным цярпеньням, прыбліжаешся да дабравольных мукаў, перавяжы нашы нанесеныя грахом раны, абмый іх Тваёй бязьмежнай міласэрнасьцю, у чалавекалюбстве Тваім паказваючы Твой збавенны клопат аб нас.

Ты, што прыняў цярпеньні мучанікаў Тваіх, прымі, Чалавекалюбча, і наша хваленьне, і малітвамі іх даруй нам багацьце зьмілаваньня Твайго.
2
*Багародзічны*. Ад усіх бедаў захавай слуг Тваіх, блаславёная; Багародзіца, каб нам славіць Цябе, надзею душ нашых.

## АЎТОРАК ПЯТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На *"Госпадзе, Цябе клічу...":***

(*Тон 8*). Зрабіўшы любоў нашай ежаю, утаймуем устрыманасьцю пажаданьні і пастараемся жыць у спосаб прыемны Богу, які дзеля нас узьнёсься на крыжы і быў прабіты кап'ём у бок, каб атрымаць спажыву вечную і лепшую, славячы Збавіцеля душ нашых.

Некалі мы нажылі сьмерць дрэвам, а цяпер дрэвам крыжовым атрымліваем жыцьцё; дык нахілы пажадлівасьцяў умярцьвім, верныя, і молім Дабрачынца усіх дачакацца збавеннага ўваскрасеньня, зьзяючы боскімі добрымі ўчынкамі і ўпрыгожаныя дабрадзейнасьцямі, славячы Збавіцеля душ нашых.

(*Тон 2*). Жыцьцядайны Твой крыж хвалім, Госпадзе, і дзеля нас Твае цяр-пеньні цялесныя: прабіцьцё кап'ём, насьмешкі, пляваньні, біцьцё і аплявухі, пурпуру і вянец цярновы, якімі ты ад праклёну вызваліў і збавіў усіх. Дзеля г этага молім Цябе даць нам закончыць мірна час посту.

*Тры песьні і крыжабагародзічны з мінэі.*

*Пракімен (Пс 89).* Госпадзе, Ты быў прыстанішчам нам з пакаленьня ў пакаленьне.

Раней, чым паўсталі горы і была створаная зямля і ўвесь сусьвет.

**Чытаньне кнігі Быцьця (*15:1-15*)**

Аўрам меў аб'яўленьне ноччу і пачуў наступныя словы Гасподнія: "Ня бойся, Аўраме, бо Я — твая абарона; дам табе вялікую ўзнагароду". Аўрам сказаў: "Уладару Госпадзе, нашто мне яна, калі ўжо блізка канец жыцьця майго і ня маю насьледніка; маім спадкаемцам будзе народжаны ад служанкі дамаскінец Еліязар". І казаў далей: "Паколькі Ты ня даў мне насьледніка, дык слуга мой будзе мне насьледнікам". Але вось зноў пачуў ён Словы Гасподнія:"Ня будзе ён тваім насьледнікам, але будзе насьледнікам той, хто народзіцца ад цябе". І загадаўшы Аўраму выйсьці вонкі, сказаў: "Глянь на неба і палічы зоркі, калі зможаш". І дадаў:"Так шматлікімі будуць твае нашчадкі" Аўрам паверыў і Госпад палічыў яму гэта ў заслугу. Потым сказаў яму: "Я — Госпад, які вывеў цябе з зямлі Ур Халдейскай, каб даць табе гэтую краіну на ўласнасьць". Аўрам сказаў: "Госпадзе Уладару, як магу я быц. пэўным, што атрымаю яе на ўласнасьць?" Тады Госпад сказаў:"Выбяры мне цялушку трохгадовую, трохгадовую туркаўку і голуба" Узяўшы іх, Аўрам перарубіў іх уздоўж на

палавіны і перарубленыя часткі паклаў адна супроць другой; птушак не разразаў. Калі да мяса пачалі зьлятацца драпежныя птушкі, Аўрам адганяў іх. А калі сонца пачало схіляцца да захаду, Аўрам заснуў глыбокім сном, і апанавала яго пачуцьцё трывогі, быццам вялікая цемра агарнула яго. І тады Госпад сказаў Аўраму: "Ведай добра, што нашчадкі твае будуць прыхаднямі ў краіне, якая ня будзе іхняй краінай, і чатырыста гадоў будуць там цярпець прыгнёт і няволю, аж пакуль не пашлю кару на народ, які іх няволіў, і яны выйдуць адтуль з вялікім набыткам. Але ты адыдзеш да тваіх продкаў у супакоі, дажыўшы да вялікай старасьці".

*Пракімен (Пс 90).* Той, хто жыве пад апекаю Ўсявышняга, у цені Бога нябеснага прабывае.

Скажа Госпаду: "Ты мой заступнік".

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*15:7-19*)

Вусны мудрых пашыраюць навуку; але не так сэрцы неразумных. Ахвяра нязбожных агідная Госпаду, прыемныя Яму малітвы сумленных. Шлях грэшніка агідны Госпаду, любіць Ён любіцеля праведнасьці. Суровая кара чакае таго, хто зыходзіць з дарогі; памрэ той, хто ненавідзіць напамінаньні. Бездань і апраметная адкрытыя перад Госпадам: тым больш сэрцы сыноў людзкіх. Насьмешнік ня любіць напамінаньняў, ён не ідзе да людзей мудрых. Радаснае сэрца вяселіць твар; калі сэрца сумуе, душа ные. Разумнае сэрца шукае мудрасьці, вусны неразумных любуюцца ў бязглуздасьці. Усе дні дрэнныя для сумнага; шчасьлівае сэрца — вечнае застольле. Лепш мець мала ў страху Гасподнім, чым вялікія багацьці ў неспакоі. Лепш міска капусты з любоўю, чым вол адкормлены нянавісьцю. Чалавек гарачы ўсчынае сварку, цярплівы суцішае закалоты. Дарога лянівых быццам усланая цернем; сьцежкі праведных гладкія.

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Зышоў я з праведнага шляху Твайго, упаў, няшчасны, у роў пажаданьняў; лявіт са сьвятаром, убачыўшы мяне, прайшлі міма, Ты ж, Хрысьце, зьмілаваўся нада мною, і зброяю Крыжа Твайго грэшны прысуд мой разарваў, бясстраснасьцю праясьніў, і ўчыніў мяне спаўжыхарам Айца; дзеля гэтага клічу: "Недасяжны Госпадзе, слава Табе".

Выйшаўшы з Ерусаліму, я адхіліўся ад напісаных у ім для народаў запаветаў Тваіх; ідучы ў Ерыхон, пераймаючы ранейшае непаслушэнства людзей, што прывяло да забойства, упаў у душазгубныя пажаданьні, быццам у рукі разбойнікаў, і паранены

імі ляжу паўмёртвы. Госпадзе, што быў дабравольна паранены цьвікамі і кап'ём з прычыны грэху людзкога, і ўчыніў Крыжам агульнае збаўленьне ў Ерусаліме, аздараві і збаў мяне.

Мучанікі твае, Госпадзе, забыліся пра дачаснае і не зважалі на мукі дзеля будучага жыцьця і, атрымаўшы яго ў спадчыне, радуюцца разам з анёламі. Малітвамі іх даруй людзям Тваім веліч зьмілаваньня Твайго.

*Крыжабагародзічны.* Калі сонца ўбачыла Цябе, Госпадзе, Сонца Справядлівасьці, павешанага на дрэве, яно скрыла праменьні свае, і месяц сьвятло на цемру перамяніў, а меч параніў сэрца ўсебеззаганнае Маці Тваёй.

## СЕРАДА ПЯТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На 'Госпадзе, Цябе клічу...':**

*Верш.* Хай нязбожныя ўпадуць у сеці свае: я ж адзін перайду бясьпечна.

*(Тон 8).* Я няшчасны папаўся ў палон думак маіх, быццам сярод разбойнікаў. Розум мой абакрадзены, і я люта пабіты, з душой параненай і пазбаўленай ўсіх дабрадзейнасьцяў, ляжу голы на ростанях жыцьця. Бачачы мяне ў вялікіх болях і думаючы, што я невылячальна хворы, сьвятар прайшоў міма, не глянуўшы на мяне. Ня могучы цярпець маіх душагубных мукаў, лявіт таксама прайшоў міма. Але Ты, Хрысьце Божа мой, які захацеў прыйсьці не з Самарыі, але уцелавіцца ад Марыі, у чалавекалюбстве Тваім дай мне аздараўленьне і вылій на мяне веліч міласэрнасьці Тваёй.

*Верш.* Голасна клічу Госпада, голасна да Гопспада малюся.

*Той самы.*

*Верш.* Перад Ім сум мой выліваю, пра тугу маю Яму расказваю.

Калі ёсьць якая дабрадзейнасьць і пахвала, дык належыць яна сьвятым: яны схілілі галовы свае пад меч дзеля Цябе, які нахіліў неба і зышоў да нас; кроў пралілі сваю дзеля Цяябе, які спустошыў сябе дзеля нас, прыняўшы выгляд слугі; упакорыліся аж да сьмерці, прыпадабняючыся ўбоству Твайму. Малітвамі іх, у мностве міласэрнасьці Тваёй, Божа, зьмілуйся над намі.

*Верш.* Дух мой зьнемагае ва мне, Ты ж ведаеш усе сьцежкі мае.

Ты, Госпадзе, паказаў нам вучняў Тваіх, як духоўнае неба. Малітвамі іх захавай нас ад усякага зла зямнога, і пастом узьнімі нашы думкі да зразуменьня Мукаў Тваіх, бо Ты мілазсэрны і Чалавекалюбец.

*Верш.* На дарозе, па якой іду, паставілі пастку на мяне.

Час посту памагае нам чыніць справы прыемныя Богу. Заплачам ад усяго сэрца і ўсклікнем Збавіцелю: "Малітвамі вучняў Тваіх, шматміласэрны Госпадзе, збаў нас, якія са страхам і пашанаю пяём хвалу Твайму вялікаму чалавекалюбству".

*Верш.* Гляджу ўправа, углядаюся: няма нікога, хто б мне спагадаў

Усяхвальныя апосталы, заступнікі сьвету, лекары нядужых, ахоўнуікі здароўя, ахоўвайце нас у гэты час Посту, каб з Божай ласкай нам захаваць супакой між сабою; захавайце наш розум свабодным ад пажаданьняў, каб нам усім магчы пяяць песьню хвалы Пераможцу Хрысту, які ўваскрос.

*Верш.* Ня маю, куды ўцякаць: няма нікога, хто б паруnіўся аб душы маёй.

*(Тон 4).* Я змарнаваў жыцьцё з блудніцамі і мытнікамі: як мне пакаяцца на старасьць у грахох маіх? Творча ўсяго і Лекару хворых, Госпадзе, перад тым, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Цябе, Госпадзе, клічу; кажу: "Ты мая надзея, мой удзел на зямлі жывых".

Я ўгінаюся пад цяжаром безуважнасьці і валяюся ў балоце; прабіты стралою д'ябальскаю я апаганіў вобраз Твой ува мне. Але Ты, Госпадзе, які навяртаеш безуважных і збаўляеш грэшнікаў, перш чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Будзь уважлівы да малітвы маёй, бо я вельмі нешчасьлівы.

Я быў каменем спатыкненьня для людзей; будучы сам зямным я зямное чыніў; уступіўшы на Твой загад у сужэнства, я зграшыў, апаганіўшы ложа маё. Але Ты, які стварыў мяне з зямлі, не пагардзі стварэньнем Тваім. Госпадзе і, перш чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Вызваль мяне ад ворагаў маіх, бо яны мацнейшыя за мяне.

Думаючы аб маім целе, я быў забойцам душы маёй і стаўся пасьмейшчам для дэманаў і нявольнікам грэшных асалодаў. У дабрасардэчнасьці Тваёй пашкадуй мяне, Праганіцелю дэманаў. Госпадзе і, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Вызваль з вязьніцы душу маю, каб мне дзякаваць імю Твайму.

Больш за ўсіх людзей я сьведама зграшыў, дзеля гэтага я пакінуты цяпер і бездапаможны. Праціўнікам маім ёсьць цялесныя думкі, што зацямняюць мяне. О Сонца тых, што ў цемры, Праваднiку ўсіх, што зблудзілі, Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Праведнікі вакол мяне чакаюць, калі Ты мне пакажаш спагадлівасьць Тваю.

Душа мая жыць будзе і славіць Цябе, Госпадзе, — сказаў прарок. — Знайдзі мяне, заблудную авечку Тваю, і залічы да выбранага статку Твайго; дай мне час пакаяцца, каб плачучы ўсклінуць Табе: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* З глыбіні клічу Цябе Госпадзе: Госпадзе, пачуй голас мой.

Зграшыў я, Хрысьце Божа мой, зграшыў, адкінуўшы прыказаньні Твае. Будзь міласэрны да мяне, Дабрачынца мой , каб мне, пазьбегнуўшы цемры, бачыць нутранымі вачыма і ў страху ўсклікнуць Табе: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Хай вушы Твае будуць уважлівыя да голасу маленьня майго.

Зьвяры дзікія акружылі мяне, але Ты ад іх выхапі мяне, Уладару: бо хочаш, каб усе людзі былі збаўленыя і прыйшлі да пазнаньня праўды. Разам з усімі клічу, Творча і Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Калі памятлівы бясчынстваў нашых будзеш, Госпадзе: Госпаде, хто зможа ўстаяцьЬ Але ж у Цябе адпушчэньне ёсьць.

Дабрачынца, Збавіцелю і Адкупіцелю мой, будзь мне аздараўленьнем; не адкінь мяне, але глянь спагадліва на мяне, які ляжу ў правінах маіх, і ўзьнімі мяне ўсемгутнай сілаю Тваёй, каб мне абвяшчаць цуды Твае і ўсклікнуць: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Дзеля імя Твайго спадзяюся на Цябе, Госпадзе: душа мая чакае слова Твайго. Душа мая спадзяецца на Госпада.

Як неразумны слуга, я схаваў талент дадзены мне, зарыўшы яго ў зямлю,быў асуджаны як бескарысны, і ня сьмею больш прасіць Цябе прабачэньня. Але ў дабраце Тваёй зьмілуйся нада мною, каб мне магчы ўсклікнуць: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Больш чым сьвітаньня чакае страж начны, больш чым сьвітаньня хай Ізраіль чакае Госпада.

Жанчына, якая цярпела крывацечаю, дакранулася да вопраткі Тваёй, і Ты асушыў крыніцу цярпеньняў яе. Прымі цяпер мяне, які прыбліжаюся да Цябе з непахіснай вераю і, як некалі яе, аздарві. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Бо ў Госпада міласэрнасьць і вялікае ў Яго збаўленьне, і Ён вызваліць Ізраіля ад усіх беззаконьняў яго.

Ты, Госпадзе, які словам стварыў неба і зямлю, сядзеш на пасадзе, перад якім нам усі трэба будзе стаць і вызнаць грахі нашыя. Перад тым, чым гэты дзень прыйдзе, прымі мяне ў каяньні. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Хваліце Госпада ўсе народы, слаўце Яго ўсе людзі.

Глянь на мяне спагадлівым вокам і будзь мне міласэрным, адзіны Збавіцелю; дай маёй беднай і лютай душы ваду аздараўленьня; ачысьці мяне і абмый брыдоту ўчынкаў маіх, каб мне клікаць: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Бо міласэрнасьць Ягоная ўмацавалася над намі і вернасьць Гасподняя трывае давеку.

Д'ябал прыгатаваў меч, хочучы ўлавіць няшчасную душу маю; ён зрабіў мяне, Міласэрны Госпадзе, чужынцам для сьвятла пазнаньня аблічча Твайго. Але Ты магутнай сілаю Тваёю, выхапі мяне з ягоных сецяў. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Я ўзьнёс вочы мае да Цябе, які жывеш у небе: як вочы слуг узіраюцца на рукі гаспадароў сваіх, і як вочы служкі на рукі гаспадыні сваёй, так вочы нашы ўзьнесеныя да Госпада Бога нашага, пакуль Ён зьмілуецца над намі.

Я стаўся нявольнікам усіх грэшных пажанадньняў, адкінуўшы Закон і Сьвятое Пісаньне. Аздараві мяне ўсяго, Дабрачынца мой, які дзеля мяне стаўся як я. Адвярні мяне ад благіх пажаданьняў. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Зьмілуйся над намі, Госпадзе, зьмілуйся над намі, бо мы перапоўненыя зьнявагай; асабліва душа наша поўная насьмешак магутных і пагарды гордых.

Блудніца сьлязамі абмыла Твае пачэсныя ногі, заклікаючы ўсіх прыблізіцца да Цябе, каб атрымаць адпушчэньне грахоў. Дай і мне ейную веру, Збаўцелю, каб я мог усклікнуць: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Ачысьці брыдоту душы маёй, Ты, што дзеля мяне зьбяднеў і стаўся ў целе дзіцяткам. Я слабы і зломаны: зышлі на мяне кроплю міласэрнасьці Тваёй; абмый мой бруд і аздараві немачы мае. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Узмоцні душу маю, Уладару, каб я мог прыбегчы да Цябе і вечна служыць Табе; Ты мой апякун і заступнік памочнік і абаронца. Зрабі, Слова Божае, мяне дастойным клікаць са сьмеласьцю: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Будзь нашай непарушнай абароннай сьцяною, Ісусе Збаўцелю, наш міласэрны Божа, бо мы ўпалі ў дрэнныя норавы і ўчынкі. Узьнімі стварэньні Твае, Дабрачынца наш і ў спагадлівасьці Тваёй прыміры нас з сабою. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Я стаўся блудным сынам і, змарнаваўшы ўсё багацьце, сёньня цярплю голад; прыбягаю пад тваю страху, Добры Войча; прымі мяне, як некалі яго, і зрабі ўдзельнікам застольля твайго, каб мне клікаць: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Дзеля зайздрасьці начальнік злога выгнаў першстворанага з раю. Але разбойнік,які на крыжы ўсклікнуў: "Успомні мяне", зноў атрымаў рай. Дык і я, з вераю і страхам, "Успомні мяне" клічу. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Працягні мне руку Тваю,Божа, як некалі Пятру, і узьнімі мяне з бездані, даруй мне ласку і зьмілаваньне, малітвамі усебеззагннае Маці, якая без семя нарадзіла Цябе, і ўсіх сьвятых Тваіх. Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Верш.* Слава Табе, Госпадзе, слава Табе.

Ягнё, што бярэ на сябе грэх мой, прымі мяне, каб я кожны дзень славіў Цябе. У Твае рукі аддаю сябе поўнасьцю —з душой і целам, — і, як належыцца, дзень і ноч клічу: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

Слава ...

Невыказны ў Тваёй спагадлівасьці, даўгацярплівы і добры Госпадзе! Ты бязгрэшны і міласэрны: Не адкінь мяне ад аблічча Твайго, каб я мог з удзячнасьцю радасна ўсклінуць: Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

Цяпер...

О невыказная спагадлівасьць! О Цудоўнае і дізўнае нараджэньне! Як гэта Дзева носіць як немаўля на руках сваіх Цябе, Тварца і Бога свайго? Дабрачынца мой, які захацеў прыняць цела ад Яе, Госпадзе, перш, чым мне згінуць да канца, збаў мяне.

*Пракімен (Пс 93).* Бог адплаты, Госпад: Бог адплаты зазьзяў. Устань, Судзьдзя зямлі, адплаці гордым па заслугах іх.

Чытаньне кнігі Быцьця (*17:1-9*)

Калі Аўраму было дзевяноста дзевяць гадоў, Госпад зьявіўся Аўраму і сказаў яму: "Я Бог твой, дагадзі мне і будзь беззаганным, бо хачу пакласьці саюз між Мною і табою, і дам табе шматлікае патомства". Аўрам паў ніц на зямлю, а Бог прадаўжаў гаварыць: "Вось мой саюз з табою: будзеш айцом многіх народаў. І ад гэтага часу ня будзеш называцца Аўрам, але іма тваё будзе Абрагам, бо ўчыню цябе бацькам многіх народаў. Зраблю цябе бязьмерна пладавітым, і будзеш бацькам шматлікіх народаў, і цары будуць

сярод нашчадкаў тваіх. Мой саюз, які заключаю з табою і тваімі нашчадкамі, будзе трываць з пакаленьня ў пакаленьне, будзе саюзам вечным, і Я буду Богам тваім і нашчадкаў тваіх. І аддаю табе і нашчадкам тваім краіну, у якой прабываеш, усю замлю Ханаанскую, на ўласнасьць давеку, і буду ім Богам" І сказаў (яшчэ) Бог Абрагаму: " Захавай саюз мой ты і ўсе нашчадкі твае праз усе пакаленьні"

*Пракімен (Пс 94).* Сьпявайце Гопспаду песьню новую: слаў Госпада, ўся зямля.

Сьпявайце Госпаду, блславіце імя Яго.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*15:20-16:9*)

Разумны сын —радасьць бацькі; дурань маці сваю зьняважае. Дурасьць — радасьць бязглуздага; разумны ідзе простым шляхам. Недахоп розуму зьніштажае намеры; добра, калі ёсьць шмат дарадчыкаў. Высказваньне вуснаў сваіх цешыць чалавека, як мілае слова, сказанае дарэчы. Сьцежка вядзе мудрага ўгору, каб пазьбегнуць апраметнай, што ў нізе. Госпад разбурыць дом гордых і ўмацуе мяжу ўдавы. Агідныя Госпаду паганыя намеры; чыстыя словы мілыя Яму. Хто нажываецца неправедна, руйнуе дом свой; жыць будзе, хто ненавідзіць хабар. Сэрца праведнага разважае, перш чым даць адказ; з вуснаў непарведных цячэ злосьць. Госпад далёкі ад благіх людзей; Ён выслухоўвае малітвы праведных. Ласкавы погляд весяліць сэрца; добрая вестка ўмацоўвае цела. Вуха, якое слухае збавеннай рады, прабывае між мудрых. Хто адкідае напамінаньні, душу сваю калечыць; хто слухае заўвагаў, набіраецца розуму. Страх Гасподні — школа мудрасьці; пакора папярэджвае славу. (16). У сэрцы чалавека родзяцца задумы ; але ад Госпада — адказ языка. У вачох чалавека ўсе сьцежкі яго чыстыя, але Госпад судзіць дух. Здайся на Госпада ў тваіх справах, і ўсе задумы твае зьдзейсьняцца. Госпад зрабіў усё для ўласнай мэты; нават грэшніка на дзень бяды. Сэрца гордае агіднае Госпаду; ён напэўна не пазьбегне пакараньня. Міласэрнасьцю і справядлівасьцю грэх выпраўляецца, а страхам Гасподнім адхіляецца зло. Калі ўчынкі людзкія Гопаду мілыя, то Ён прымірыць з ім нават ворагаў. Лепш мець крыху але справядліва, чым несправядлівыя вялікія прыбыткі. Сэрца людзкое абмяркоўвае дарогу, а Госпад кіруе крокамі яго.

*Літургія Раней Асьвячаных Дароў.*

## ЧАЦЬВЕР ПЯТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 8).* Дабравольна першаю правінаю я пазбавіў сябе красы дабрадзей-насьцяў, але зноў набыў яе дзякуючы Твайму, Слова Божае, у дабраце пані-жэньню. Не пагардзіў Ты мною, калі я ўпаў у лютыя пажаданьні, і паранены быццам разбойнікамі ляжаў ля дарогі, але усемагутнай сілаю Тваёю ты заапекаваўся мною і ўспамог мяне у вялікай міласэрнасьці Тваёй. **(Двойчы).**

Мучанікі Гасподнія, вы ўсякае месца асьвячаеце і ўсякую немач аздараў-ляеце. Дык просім вас, маліцеся, каб ад варожых сецяў вызваліцца душам нашым.

*(Тон 1).* Прыбіты да Крыжа, Ты, Госпадзе, боскім кап'ём разьдзёр прысуд Адамавага граху; дык разарві путы мае, Слова, каб я мог прынесьці Табе ахвяру хвалы ў радасьці, асягнуўшы прыемны час посту, які Ты ўстанавіў для збаўленьня ўсіх.

Зьзяючы некалі сьветласьцю посту, Майсей бачыў славу Божую; пераймаючы яго, пакорная душа мая, дагадзі ўчынкамі, устрыманасьцю і малітваю Таму, хто дзеля цябе ў дабраце сваёй на Крыжы рукі распасьцёр, каб табе быць удзельніцай Боскай радасьці.

*(Тон 6).* Пакланяемся жыцьцядайнаму Крыжу Твайму, Хрысьце, на якім Ты пацярпеў дзеля невыказнай Тваёй дабраты; і прасьвятліўшы ім душы, славім Цябе безустанку, просячы, каб нам скончыць добра час посту і ўславіць Мукі Твае, Госпадзе, якімі Ты збавіў нас.

*Тры песьні і крыжабагародзічны з мінэі.*

*Пракімен (Пс 98).* Узьвялічвайце **Госпада** Бога **нашага і** пакланяйцеся падножку ног Яго, бо Ён **сьвяты.**
Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу.

**Чытаньне кнігі Быцьця** *(18:20-33)*

Госпад сказаў: "Скаргі на Садому і Гамору чутныя вакол, і грахі жыхароў іх вельмі цяжкія. Зыду, каб пабачыць, ці яно сапраўды так, як у скаргах, якія даходзяць да мяне, каб ведаць". І гэтыя людзі адышлі ў бок Садомы, а Абрагам стаяў далей перад Госпадам. Прыблізіўшыся да Яго, Абрагам сказаў: 'Няўжо ж Ты сапраўды хочаш выгубіць праведнага з грэшнікам? А можа ў гэтым горадзе знойдзецца пяцьдзесят праведнікаў: ці тады зьнішчыш горад і не прабачыш яму дзеля гэтых пяцідзесяці

справядлівых, якія там жывуць? Хіба можаш такое ўчыніць? Ці загубіш праведнага разам з нязбожным, ці справядліваму будзе тое самае што і няправедніку? Ці ж Судзьдзя ўсёй зямлі можа паступаць несправядліва?" Госпад сказаў: "Калі знайду ў Садоме пацьдзесят праведнікаў, памілую ўвесь горад дзеля іх". Тады Абрагам адказаў: "Вось я, зямля і пыл, асьмельваюся гаварыць да Госпада. Можа да пяцідзесяці будзе не ставаць пяці, дык ці зьнішчыш дзеля гэтых пяці ўвесь горад?" Госпад сказаў: "Ня зьнішчу калі знайду там сорак пяць". Зноў прамовіў Абрагам да Госпада, кажучы: "А можа іх там будзе толькі сорак?" І Госпад адказаў: "Не зраблю гэтага дзеля сарака" Тады Абрагам сказаў: "Прашу ня гневацца, Госпадзе, калі я яшчэ скажу: а можа іх там знойдзецца толькі трыццаць?" І адказаў: "Не зраблю, калі знайду там трыццаць" Тады той зноў:"Вось я асьмеліўся гаварыць да Госпада: а можа іх там знойдзецца толькі дваццаць?" На гэта Госпад адказаў: "Ня зьнішчу дзеля дваццаці". Уканцы Абрагам сказаў: "Ня гневайся, Госпадзе, калі яшчэ спытаю: а калі б іх там знайшлося дзесяць?" Госпад адказаў: "Ня зьнішчу дзеля гэтых дзесяці" Тады Госпад, скончыўшы размову з Абрагамам, адышоў, а Абрагам вярнуўся на сваё месца.

*Пракімен (Пс 99).* Сьпявай Госпаду, уся зямля.
Служыце Госпаду ў радасьці

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*16:17-17:17*)

Дарога справядлівых — пазьбягаць зла; хто сьцеражэ сьцежкі свае, ахоўвае жыцьцё. Гібелі папярэджвае гордасьць; упадку —дух бунтарны. Лепш быць сьціплым сярод пакорных, чым з гордымі дзяліць здабычу. Хто на словы зважае, той знаходзіць дабро; шчасьлівы, хто спадзяецца на Госпада. Разумным назавуць таго, у каго сэрца мудрае; ласкавасьць вуснаў дае навука. Розум — крыніца жыцьця для тых, што яго маюць; дурасьць — неразумных кара Сэрца мудрага навучае вусны яго і губам яго дае пазнаньне. Добрыя словы — плястр мёду, слодыч для душы і лякарства для цела Голад работ-ніка працуе на яго, бо вусны прымушаюць яго (працаваць). Нягоднік рыхтуе зло, быццам агонь гарыць на вуснах яго. Крывадушны чалавек сее нязгоду, а даношчык разьдзяляе прыяцеляў. Гвалтаўнік зводзіць суседа свайго, і вядзе яго на благі шлях. Хто зачыняе вочы, той хітрасьці кнуе; а хто вусны кусае, той учыніў праступак. Сівыя валасы — вянец пачэсны: яго знаходзяць на праведным шляху. Цярплівы лепшы за сільнага, а той, хто апаноўвае гнеў — за пераможцу. Жэрабя кідаюць у пазуху, але вынік залежыць ад Госпада. (17). Лепш кусок сухога хлеба ў супакоі, чым хата поўная страваў, дзе няма згоды. Разумны слуга будзе кіраваць нягодным сынам — з

братамі ён займе спадчыну. Як горн серабро і печ золата, так Госпад выпрабоўвае сэрцы. Злачынец уважлівы на згубную мову; а брахун прыслухоўваецца да лісьлівага языка. Хто сьмяецца з беднага, той зьневажае яго Тварца; хто цешыцца з няшчасьця, не пазьбегне кары;. Вянец старых людзей — сыны сыноў; слава ж дзяцей — бацькі іх. Не да твару дурню мова разумная; тым менш для ўладара — вусны хлусьлівыя. Гасьцінец — самацьвет для таго, хто дае: куды б ён не зьвярнуўся, будзе мець шчасьце. Хто шукае любові, хавае чужую памылку; хто разгалошвае яе, разьдзяляе прыяцеляў. Дакор мацней узьдзейнічае на разумнага, чым на дурня сто ўдараў біча. Благі чалавек шукае толькі закалоту; за гэта пасланы яму будзе анёл няшчасьця. Лепш мець справу з мядзьведзіцай, якая страціла мядзьведзянятаўаў, чым з дурныем, які шалее. Хто плаціць злом за дабро, зло з яго хаты ня выйдзе. Пачаць сварку, быццам ваду пусьціць: уцякай, пакуль пачнецца сварка. Хто апраўдвае вінаватага і той, хто нявінаватага абвінавачвае — абодвы яны агідныя Госпаду. Нашто грошы ў руках дурня? Не стае яму розуму, каб набыць мудрасьць. Прыяцель любіць у кожным часе,: ён будзе братам, калі прыйдзе няшчасьце.

*Літургія Раней Асьвяцаных Дароў.*

## ПЯТНІЦА ПЯТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 6).* Пакінуўшы твае прыказаньні, быццам Ерусалім, і ідучы да пажаданьняў Ерыхонскіх, спакушаны прывабнасьцю славы і жыцьцёвых клопатаў, я папаўся ў рукі разбойніцкіх думак маіх і быў абдзёрты імі з вопраткі ласкі ўсынаўленьня. І цяпер вось ляжу, паранены, быццам нежывы. Сьвятар, праходзячы міма, убачыў цела маё, але не затрымаўся; лявіт глянуў з агідаю і перайшоў на другі бок. Але ты, Госпадзе, які прыняў невыказна цела ад Дзевы, праліцьцём са збаўеннага боку Твайго крыві і вады дзеля майго збаўленьня, быццам, алівай памазаў мяне. У міласэрнасьці Тваёй, Хрысьце Божа, абвяжы раны мае і зрабі ўдзельнікам Твайго нябеснага валадарства. *(Двойчы)*

Мучанікі Твае, Госпадзе, не адракліся ад Цябе і не адступілі ад запаветаў Тваіх. Малітвамі іх зьмілуйся над намі.

*(Тон 6).* Спрадвечны плян абвясьціў Табе, Сьвятая Дзева, Габрыель, стаўшы перад табою, і прывітаўшы, кажучы: "Радуйся, зямля незасеяная; радуйся, незгаральны кусьце; радуйся,

глыбіня недасяжная; радуйся, мосьце, што вядзе да неба, і лесьвіца высокая, якую бачыў Якуб; радуйся, боскі посудзе манны; радуйся, ад праклёну звальненьне; радуйся, вызваленьне Адамава: Госпад з табою"

"Ты зьявіўся мне ў выглядзе чалавека — кажа арханёлу Чыстая Дзева,— дык як жа ты мне гаворыш рэчы, вышэйшыя за розум людзкі. Ты ж кажаш, што Госпад са мною і што Ён паселіцца ва ўлоньні маім. Скажы мне, як гэта я стануся так прасторным паселішчам і месцам сьвятасьці, вышэйшым за херувімаў? Не спакушай мяне хітрасьцямі, бо мне любасьць чужая, і не знаю сужэнскага жыцьця: як жа тады я нараджу дзіця?"

"Калі Бог хоча, законы прыроды адмяняюцца — кажа ёй арханёл, — і дзеюцца рэчы звышлюдзкія. Дык вер словам маім, Найчыстая і Бязьвінная, бо яны праўдзівыя". Яна ж тады адказала: "Хай станецца мне згодна са словам Тваім. Нараджу Бесьцялеснага, які возьме цела ад мяне, каб, будучы ўсемагутным, зьяднацца з чалавекам і вярнуць яго да ранейшай годнасьці"

Слава ... цяпер ...

*(Тон 6).* Спрадвечная тайна сёньня робіцца яўнаю: Сын Бога стаецца Сынам людзкім, каб, успрыняўшы горшае, зрабіць мяне ўдзельнікам лепшага. Ашукаўся некалі Адам: ён хацеў быць, як Бог, але ня змог. Цяпер Бог стаецца чалавекам, каб Адама абагавіць. Хай цешыцца ўсё стварэньне, хай сусьвет радуецца: вось арханёл стаіць у страху перад Дзеваю і з прывітаньнем "Радуйся!" абвяшчае радасную вестку, што адмяняе наш сум. Божа,які ў вялікай спагадлівасьці Тваёй стаўся чалавекам, слава Табе!.

*Пракімен (Пс 102).* Шчодры Бог і міласэрны, доўгацярплівы і багаты на ласку.

Благаслаўві, душа мая, Госпада, і ўсё нутро маё хай славіць імя сьвятое Яго.

**Чытаньне кнігі Быцьця (*22:1-18*)**

Бог выпрабоўваў Абрагама, кажучы: "Абрагаме!". А той адказаў: "Вось я". Бог сказаў: "Вазьмі сына твайго любага Ісаака, пайдзі ў краіну Морыю і прынясі яго там як цэлапальныую ахвяру на адной з гараў, якую Я табе пакажу". Абрагам устаў рана-рана, асядлаў асла, узяў з сабою двух слугаў і сына свайго Ісаака і, нарыхтаваўшы дроваў для цэлапаленьня, пайшоў. На трэці дзень прыйшоў на месца, якое яму вызначыў Госпад Бог. Глянуўшы, Абрагам убачыў здалёку месца. І кажа Абрагам

слугам сваім: "Пабудзьце тут з аслом, а я і сын пойдзем туды вось і, пакланіўшыся, вернемся". Узяў Абрагам дровы для цэлапаленьня і ўсклаў іх на Ісаака, сына свайго; узяў у рукі агонь і нож, і пайшлі яны абодва. Кажа Ісаак Абрагаму, бацьку свайму: "Ойча" Ён жа адказвае : "Што табе, дзіця?" Той кажа: "Вось агонь і дровы, а дзе ж ягнё для цэлапаленьня?" Абрагам адказаў: "Бог падбае сабе аб ягняці, сыне". І ішлі яны абодвы разам. І прыйшлі на месца, якое паказаў яму Бог; і ўладзіў там (Абрагам) ахвярнік і палажыў дровы; і, зьвязаўшы Ісаака, сына свайго, паклаў на ахвярнік паверх дроваў. І працягнуў Абрагам руку сваю па нож, каб зарэзаць сына свайго. Але вось анёл Гасподні з неба ўсклікнуў :"Абрагаме, Абрагаме!" "Вось я", — адказаў ён. А той кажа: "Не працягні рукі тваёй на сына твайго і не зрабі яму нічога! Сёньня Я пазнаў, што ты баішся Бога, і не пашкадаваў сына твайго любага дзеля Мяне". Абрагам узьняў вочы і бачыць — вось баран адзін запутаны рагамі ў кустах. Пайшоўшы, Абрагам узяў барана і прынёс яго як цэлапаленьне замест Ісаака, сына свайго. І назваў Абрагам месца гэтае "Госпад бачыць". Адсюль і сёньня кажуць: "Госпад на гары зьявіўся" І паклікаў анёл гасподні Абрагама другі раз, кажучы: "Клянуся Мною самім — кажа Госпад, — што паколькі ўчыніў ты гэтае і не пашкадаваў сына вайго любага дзеля Мяне, сапраўды пабласлаўлю цябе бласлаўленьнем і дам табе нашчадкаў, як зорак у небе і як пяску на беразе мора; і нашчадкі твае атрымаюць у спадчыне гарады ворагаў; і ў нашчадках тваіх будуць блаславёныя ўсе народы зямлі за тое, што ты паслухаў голасу Майго."

*Пракімен (Пс 103).* Якое багацьце твораў Тваіх, Госпадзе: Ты ўсё мудра стварыў.

Блаславі, душа мая, Госпада: Госпадзе, Божа мой, Ты вялікі наўзьдзіў.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*17:17-18:5*)

Браты ў няшчасьці карысныя будуць: дзеля гэтага яны і родзяцца. Ня мае розуму той, хто абавязваецца, хто дае паруку за бліжняга. Хто любіць сваркі, любіць грэх; нахабны шукае загубы. Сэрца крывадушнае не зазнае шчасьця; язык хлусьлівы трапляе ў бяду. Хто родзіць дурня, клопаты сабе родзіць; бацька дурня радасьці не знае. Вясёлае сэрца — найлепшыя лекі; прыгноб-лены сушыць косьці свае. Нягоднік выцягвае гасьцінец зза пазухі, каб скрывіць сьцежкі праведных. Мудрасьць разумнага перад вачыма яго; вочы дурня на канцы зямлі. Дурны сын — клопат для бацькі і горыч для маці сваёй. Нядобра караць справядлівага і біць высакароднага за паведнасьць яго. Дурань, калі маўчыць, здаецца мудрым і разважлівым, калі вусны зачыніць. (18). Той,

хто адмяжоўваецца ад прыяцеляў, ідзе а ўласнай воляй: кожная рада, усё разумнае, злуе яго. Дурань ня любіць застанаўляцца, ён толькі адчыняе сэрца сваё. З праступкам ідзе пагарда, а з ганьбаю сорам. Вада глыбокая — словы вуснаў людзкіх; струмень разьліўны — мудрасьці крыніца. Нядобра падтрымліваць вінаватага, а на судзе крыўдзіць справядлівага.

*Літургія Раней Асьвячаных Дараў.*

## ЛІТУРГІЯ Ў СУБОТУ АКАФІСТА.

*Трапар (тон 8).* Як толькі атрымаў тайны загад, арханёл Габрыель сьпешна зьявіўся ў доме Язэпа і сказаў Найчыстай Дзеве: "Той, хто нахіліў нябёсы, каб зыйсьці на зямлю, зьмяшчаецца ў Табе, застаючыся нязьменным. Бачачы Яго ва ўлоньні Тваім у выглядзе слугі, абняты страхам усклікаю: Радуйся, Дзева Маці!"

*Кандак (тон 8).* Магутная Ўладарка Багародзіца, мы, верныя слугі твае, выбаўленыя табою ад бедаў, песьні ўдзяч-насьці і перамогі табе прыносім.Ты ж, маючы сілу неперамож-ную, ад усякіх напасьцяў выратуй нас, каб нам усклікнуць табе:"Радуйся, Дзева Маці"

*Пракімен, алілуя, апостал, евангельле і прычасьнік Багародзіцы*

## ПЯТАЯ НЯДЗЕЛЯ ВЯЛІКАГА ПОСТУ
### Памяць Сьвятое Маці нашае Марыі Ягіпецкай

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."** *сем песьняў нядзельных належнага тону і тры наступныя*:

*(Тон 6).* Дзеля брыдоты ранейшых грахоў тваіх ты ня сьмела глянуць на пачэсны Крыж; сумленьне тваё, і ўсьведамленьне зробленых учынкаў, навярнулі цябе, багамудрая, на добры шлях. Глянуўшы на ікону блаславёнае Божае Дзевы, і пакаяўшыся ва ўсіх ранейшых правінах, ты, усяхвальная, сьмела пакланілася сьвятому дрэву.

Пакланіўшыся радасна месцам сьвятым, ты, блаславёная, атрымала там настаўленьне ў дабрадзейнасьці, і пайшла па выбраным табою добрым шляху. Перайшоўшы Ярдан, ты набожна пасялілася ў жыльлі Прадвесьніка і, пагасіўшы лютасьць пажаданьняў пастом і малітваю, перамагла цялесныя нахілы, Маці ўсепамятная.

Пасяліўшыся ў пустыні, ты змыла з душы тваёй вобразы грэшных пажаданьняў, падмяніўшы іх Богам дадзеным вобразам дабрадзейнасьці; і так зазьзяла сьвятасьцю жыцьця твайго, што магла па вадзе лёгка хадзіць, і падчас малітвы да Бога ўзьнімалася над зямлёй. І цяпер, усяслаўная Марыя, сьмела стоячы перад Хрыстом, маліся за душы нашы.

Слава ...

*(Тон 4).* Сіла Крыжа Твайго, Хрысьце, цуд учыніла: ранейшая грэшніца выбрала шлях дабрадзейнасьці, праводзячы жыцьцё ў малітве і пасце; адкінуўшы слабасьці свае, яна сьмела супрацівілася д'яблу, і цяпер, атрымаўшы ўзнагароду перамогі, моліцца за душы нашы.

Цяпер ...

*Дагматык належнага тону.*

**Вершапесьні** *нядзельныя належнага тону.*

Слава ...

*(Тон 2).* Нутраныя закалоты і цялесныя пажаданьні мячом устрыманасьці ты перасякла; грэшныя думкі здушыла маўчаньнем, і струменямі сьлёз напаіла пустыню, узрасьціўшы нам плады

пакаяньня. **Дзеля гэтага, Маці бласлаўлёная, сьвяткуем сёньня памяць тваю.**

Цяпер...

*(Тон 2).* Новы цуд, большы за ўсе ранейшыя цуды! Хто калі бачыў Маці, якая радзіла без мужа і на руках насіла Таго, хто трымае ўсё стварэньне? З Божай волі радзіўся той, каго Ты, Усячыстая, насіла як дзіцятка на руках тваіх. Маючы матчыну сьмеласьць у Яго, не пераставай маліцца за тых, што шануюць цябе, каб Ён дараваў нам багацьце ласкі сваёй і збавіў душы нашы.

**Адпушчальныя трапары**

***Трапар нядзельны належнага тону.***

Слава...

*Трапар Марыі (тон 8).* У табе, Маці, верна зьбярогся вобраз Божы: узяўшы крыж, ты пайшла ўсьлед за Хрыстом і на справе навучала не клапаціцца аб целе, бо яно праміне, але дбаць пра душу, рэч несьмяротную. Дзеля гэтага разам з анёламі радуецца, сьвятая Марыя, дух твой.

Цяпер ...

*Багародзічны (тон 8).* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць і паказаўшыся Богам ва ўваскрасеньні, не пагардзі творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Твае, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, што нарадзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.

## ЛІТУРГІЯ

***Трапар нядзельны адпаведнага тону.***

***Трапар Марыі (тон 8).*** **У табе, Маці...** ***(Гл. вышэй)***

Слава ...

*Кандак Марыі (тон 3).* Грахамі ўсякімі раней перапоўненая, ты, пакаяўшыся, сталася нявестай Хрыстоваю і, пераймаючы анельскае жыцьцё, дэманаў перамагаеш зброяй крыжоваю. Дзеля гэтага ты цяпер — нявеста ўладарства, Марыя слаўная.

Цяпер ...

*Кандак Багародзіцы (тон 8).* Магутная Уладарка Багародзіца, мы, верныя слугі Твае, выбаўленыя табою ад бедаў, песьні ўдзячнасьці і перамогі Табе прыносім. Ты ж, маючы сілу непераможную, ад усякіх напасьцяў выратуй нас, каб нам усклікнуць Табе: "Радуйся, Дзева Маці!"

*Пракімен (Пс 75:12,2).* Выконвайце абяцаньні, дадзеныя Госпаду Богу нашаму.

Бог вядомы ў Юдэі, у Ізраілі вялікае імя Яго.

*Апостал:* Гэб. 9:1-14

*Алілуя (Пс 94:1,2).* Прыйдзіце, будзем радасна пяяць Госпаду, будзем славіць Бога Збавіцеля нашага.

Станем з удзячнасьцю перад абліччам Ягоным, у песьнях уславім Яго.

*Евангельле:* Мк.10:32-45

*Задастойнік.* У табе радуецца, Поўная ласкі, усякае стварэньне - сабор анёлаў і род людзкі, - асьвячаны хораме і раю духоўны, пахвала дзеваў; ад цябе Бог прыняў цела і стаўся дзіцяткам, Бог наш спрадвечны: улоньне твае Ён зрабіў пасадам сваім, і нутро твае ўчыніў больш прасторным за неба. У табе радуецца, Поўная ласкі, усякае стварэньне: слава табе.

## НЯДЗЕЛЯ ПЯТАЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."** ***чатыры песьні актойха належнага тону; пасьля:***

*(Тон I).* Будучы багатым, Ты стаўся ўбогім, узбагаціўшы чалавека несьмяротнасьцю і сьвятлом. Дык і мяне, зьбяднелага асалодамі жыцьця, узбагаць дабрадзейнасьцямі і ўчыні саўдзельнікам лёсу ўбогага Лазара, вызваляючы ад удзелу ў мучэньнях багача, і ад пекла, якое чакае мяне.

Я, Госпадзе, стаўся багаты на зло, палюбіў слодыч, і насыціўся дачаснымі жыцьёвымі дабротамі, і таму заслужыў на пякельны агонь. Я пагардзіў, быццам Лазарам, маім згаладалым розумам: вось ён ляжыць перад варотамі боскіх дабрадзейных учынкаў. Але Ты, Уладару, зьмілуйся нада мною

Пачынаючы шосты тыдзень пачэснага посту, прынясем, верныя, быццам вербы, перадсьвяточны сьпеў Госпаду, які ідзе ў славе і сіле Боства ў Ерусалім, каб перамагчы сьмерць. Дык прыгатуем Яму галінкі дабрадзейнасьцяў, як вобраз перамогі, і ўсклікнем "Гасанна!" Тварцу ўсіх.

*Тры песьні і багародзічны з мінэі.*

**Вершапесьні**

*(Тон I).* Цудоўны чалавекалюбны провід Збавіцеля дзеля нас: ведаючы тое, што будзе, быццам сучаснае, Ён паказаў перад нашымі вачыма жыцьцё багача і Лазара. Разважаючы над канцом іх, пастараемся пазьбегнуць самалюбства і нялюдзкасьці першага, і быць пераймальнікамі стойкасьці і доўгацярплівасьці другога, каб і нам разам з ім ва ўлоньні Абрагама ўсклікнуць: "Судзьдзя справядлівы, Госпадзе, слава Табе!" *(Двойчы)*

Малітвамі, Госпадзе, усіх сьвятых і Багародзіцы, даруй супакой Твой усім нам і зьмілуйся над намі, бо Ты добры і міласэрны.

*Багародзічны.* Радасьць анельскіх хораў, і людзей на зямлі магутная заступніца, Усячыстая Багародзіца, збаў нас, якія да Цябе прыбягаем, бо пасьля Бога мы ўсклалі надзею на цябе.

## ПАНЯДЗЕЛАК ШОСТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 6).* Многімі правінамі і асалодамі жыцьцёвымі я, няшчасны, параніў хворую душу маю, Уладару; цяпер ляжу на пасьцелі ленасьці і клічу: "Прыйдзі, наведай мяне, Міласэрны, даруючы мне здароўе і міласьць; не пакінь мяне, каб мне не заснуць сьмяротным сном і каб вораг, які ўсё стараецца зьвесьці мяне ў глыбіню апраметную, ня цешыўся з гібелі маёй"

Пазайздросьціўшы, Госпадзе, бяздумна неміласэрнаму багачу, соладка весялюся і таплюся ў асалодах і пажадлівасьцях і, бачачы мой згаладалы розум паранены пажаданьнямі, — што, быццам Лазар, ляжыць перад дзьвя-рамі пакаяньня, — абыякава пераходжу ля яго . За гэта ўсё я заслужыў на агонь пякельны, але Ты, многаміласэрны ўладару, выбаў мяне ад яго.

*(Тон 5).* Ходзячы па тым баку Ярдану, Ты, Госпадзе, прадсказаў, што хвароба Лазара не будзе яму на сьмерць, але на славу Табе, Богу нашаму, і на паказ велічы і магутнасьці ўчынкаў Тваіх: бо Ты, Чалавекалюбча, перамог сьмерць, у вялікай міласэрнасьці Тваёй,

*Тры песьні і багародзічны з мінэі.*

*Пракімен (Пс 106).* Слаўце Госпада, бо Ён добры, бо міласэрнасьць яго вечна трывае.

Хай скажуць збаўленыя Госпадам, што Ён добры, што міласэрнасьць Яго вечна трывае.

**Чытаньне кнігі Быцьця (*27:1-41*)**

Калі састарэўся Ісаак і зрок яго прытупіўся так , што ня мог бачыць, ён паклікаў Ісава, свайго старэйшага сына, кажучы: "Сыне мой!" А калі той адгукнуўся: "Я тут!", Ісаак сказаў: "Я ўжо стары і ў кожную хвіліну магу памерці. Вазьмі свае паляўнічыя снасьці, твой калчан і лук, ідзі ў поле, упалюй мне дзічыну, звары для мяне смачную страву так, як я люблю, і прынясі яе мне: няхай з'ем яе, каб благаславіла цябе душа мая перад сьмерцю" Рэбэка чула, што гаварыў Ісаак Ісаву, сыну свайму. І калі пайшоў Ісаў у поле, каб упаляваць дзічыну для бацькі, Рэбэка сказала Якубу, любаму сыну свайму: "Я чула, як твой бацька казаў Ісаву, брату твайму: 'Прынясі мне дзічыну і звары мне смачную страву, каб я з'еў і паблаславіў цябе ў імя Госпада перад тым, чым памерці' Цяпер жа, сыне мой, паслухай, што я табе скажу. Ідзі, вазьмі з чарады двое казьлянят добрых, а я звару з іх смачную страву для

твайго бацькі так, як ён любіць. Тады занясеш яе твайму бацьку, каб ён зьеў і паблаславіў цябе перад сьмерцю" Але Якуб кажа Рэбэцы: "Але ж Ісаў, брат мой, мужчына валасаты, а я гладзенькі. Калі бацька захоча дакрануцца да мяне, будзе выглядаць, быццам я жарты строю з яго, і таму магу навесьці на сябе праклён а не благаславенства" Тады кажа яму ягоная маці: "На мне будзе твой праклён, сыне мой! Ты толькі слухай мяне і ідзі прынясі мне (казьлянят)". Ён пайшоў і прынёс іх сваёй маці; а яна зварыла смачную страву, як ляюбіў яго бацька. І ўзяла Рэбэка найлепшую вопратку Ісава, што была ў хаце, і апранула ў яе Якуба, свайго малодшага сына, а казьлінымі шкурамі абклала ягоныя рукі і гладкую шыю. Тады дала яна Якубу, сыну свайму, смачную страву, якую зварыла, і хлеб. І ён пайшоў да свайго бацькі і кажа: "Войча мой!" А той адгукнуўся: "Я тут. Хто ты, мой сыне?" Тады Якуб кажа бацьку: "Я Ісаў, твой першародны. Я зрабіў так, як ты мне загадаў. Падыміся, сядзь і зьеш упаляванай мною дзічыны, каб благаславіла мяне душа твая" А Ісаак кажа сыну: "Нешта хутка ты, сыне, знайшоў яе." А Той адказаў: "Госпад Бог твой, так зрабіў мне" Тады Ісаак сказаў Якубу: "Падыдзі бліжэй да мяне, каб, дакрануўшыся, я мог упэўніцца што ты сапраўды Ісаў, сын мой" Якуб падышоў да Ісаака, а той, дакрануўшыся да яго, сказаў: "Голас Якуба, а рукі Ісава". І так не пазнаў ён Якуба, бо рукі яго былі валасатыя, як рукі Ісава. І благаславіў яго. Потым спытаў: "Ці сапраўды ты мой сын Ісаў?" А той адказаў: "Так, гэта я" Тады сказаў (Ісаак): "Дай, хай зьем дзічыны сына майго, каб мая дуўша благаславіла цябе" І той даў яму, і ён еў; прынёс яму віна і ён выпіў. Тады кажа яму Ісаак, бацька яго: "Падыдзі бліжэй і пацалуй мяне, сыне мой" І ён падышоў і пацалаваў яго. І пачуў Ісаак запах вопраткі яго і паблаславіў яго, кажучы: "Гэта запах сына майго, як запах поля, якое паблаславіў Госпад. Няхай Бог дасьць табе расу з неба і зямлю ўрадлівую, удосталь пшаніцы і віна. Няхай народы служаць табе і пака-леньні пакланяюцца перад табою. Будзеш валадарыць над братамі тваімі, і сыны маці тваёй пакланяцца табе. Пракляты хай будзе той, хто цябе праклінае, і благаславёны, хто цябе благаслаўляе".

Толькі Ісаак скончыў благаслаўляць Якуба, і Якуб адышоў ад Ісаака, бацькі свайго, як вярнуўся з паляваньня Ісаў, брат ягоны,. Ён таксама зварыў смач-ную страву, прынёс бацьку свайму і кажа: "Хай бацька падымецца і зьесьць дзічыны сына свайго, каб душа яго благаславіла мяне" Тады Ісаак, ягоны бацька, спытаў: "Хто ты?" Ён адказаў: "Я сын твой першародны Ісаў". Жахнуўся Ісаак і ўстрывожаны пытае: "Хто ж тады той, што ўпаляваў дзічыну, прынёс мне, і я зьеў перад тым, чым ты прыйшоў, і паблаславіў яго, так што маё благаславенства пры ім астаецца?" Калі Ісаў пачуў словы бацькі свайго, ён усклікнуў моцна жаласным голасам і сказаў свайму бацьку: "Благаславі і мяне, войча мой!" А той сказаў:

"Прыйшоў твой брат і подступам забраў тваё блаславенства" Тады Ісаў сказаў: "Недарма далі яму імя Якуб. Два разы ён ашукаў мяне: пазбавіў мяне майго першародства, а цяпер забраў маё блаславенства!" На гэтыя словы Ісаак адказаў Ісаву: "Я паставіў яго тваім уладаром, і даў яму ўсіх братоў яго за слуг; хлебам і віном забясьпечыў яго. Што магу зрабіць для цябе, мой сыне?" Тады Ісаў кажа бацьку свайму: "Няўжо ж у цябе, бацька, толькі адно блаславенства? Блаславі і мяне, бацька мой!" І заплакаў Ісаў голасна. Тады бацька ягоны Ісаак даў яму такі адказ: "Ня будзе ўрадлівай краіна, у якой будзеш жыць, бо ня будзе там расы з неба. Жыць будзеш з мяча твайго і будзеш слугою брата твайго. Але прыйдзе час, калі станеш свабодны і скінеш ярмо з шыі тваёй" І Ісаў узьненавідзеў Якуба за блаславенства, якое яму даў ягоны бацька.

*Пракімен (Пс 107).* Узьнясіся на Нябёсы, Божа, і хай па ўсёй зямлі разы-дзецца слава Твая.

Гатовае сэрца маё, Божа, гатовае сэрца маё.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** *(19:16-25)*

Хто захоўвае прыказаньні, зьберагае жыцьцё; хто ня дбае аб дарогах сваіх, памрэ. Хто чыніць дабро беднаму, дае пазыку Госпаду, і Той яго ўзнагародзіць за яго дабрадзейства. Карай сына твайго, пакуль ёсьць надзея, але ня бій яго да сьмерці. Гняўлівы будзе пакараны: калі яго пашкадуеш, павялічыш няшчасьце. Слухай рады і прымай навучаньне, каб быць мудрым у будучыні. Шмат намераў у сэрцы людзкім, але воля Господняя зьдзейсьніцца. Прывабнасьць чалавека — ягоная дабрата; лепш бедны, чым хлус. Страх Господні вядзе да жыцьця: напоўнены ім кладзецца спакойны ( і не сустрэне яго зло). Лянівы руку сваю апускае ў міску, але цяжка яму яе да роту данесьці. Калі ўдарыш насьмешніка, то і прастадушны стане разумнейшым; калі напомніш разумнага — яму веды прыбудзе.

**Вершапесьні**

*(Тон 4).* Ад ліхвярства, што абкрадае душу, вызваль нас, Збавіцелю, і пасялі нас разам з убогім Лазарам ва ўлоньні Абрагама: бо Ты, Божа, багаты на міласэрнасьць, дзеля нас добравольна стаўся бедным, і ад тленнасьці да нятленнасьці перавёў нас у міласэрнасьці і чалавекалюбстве Тваім. *(Двойчы)*

Ты, што прымаеш цярпеньні мучанікаў сьвятых, і ад нас прымі, Чалавека-любча, песьню хвалы, і малітвамі іх даруй нам веліч зьмілаваньня Твайго.

*Багародзічны.* Выбаў нас ад бед нашых, Маці Хрыста Бога, што нарадзіла Тварца ўсіх, каб нам усім клікаць:"Радуйся, адзіная затуліца душ нашых!"

## АЎТОРАК ШОСТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 2).* Подступамі хітрага ворага сэрца маё зьнемагае, зыходзіць у магілу безнадзейнасьці і, быццам каменем, пакрываецца нячуласьцю. Але Ты, Збавіцелю, які дрэвам жыцьцядайнага крыжа ажывіў усіх, што былі ў пекле, узьнімі мяне і ажыві, каб я са страхам і пашанаю славіў Боскасьць Тваю.

Багацьце пажаданьняў, што вядуць да тленнасьці, за прычынаю хітрага ворага, я палюбіў, бяздумна праводзячы час у пустым вясельлі; прыйшоўшы да розуму, я, як Лазар, зажадаў Боскай стравы і, стогнучы, ўсклікаю: "Ад полымя, якое чакае мяне , вызваль мяне, Слова:,у добрасардэчнасьці Тваёй, каб мне славіць Цябе, Чалавекалюбча".

*(Тон 3).* Сёньня памёр Лазар, і ўся Бэтаньня плача; Ты ж , Збавіцелю, зноў уздымаеш яго ад сьмерці, прадвяшчаючы прыяцелям Тваім страшнае ўвакрасеньне Тваё, умярцьвленьне пекла, і ажыўленьне Адама. Дзеля гэтага славім Цябе.

*Тры песьні і крыжабагародзічны з мінэі.*

*Пракімен (Пс 110).* Пачатак мудрасьці — страх Гасподні.
Буду славіць Цябе, Госпадзе, усім сэрцам маім.

**Чытаньне кнігі Быцьця** (*31:3-16*)

Сказаў Госпад Якубу: "Вярніся на зямлю бацькі твайго, на радзіму тваю, і Я буду з табою" Якуб, які быў на полі са статкам сваім, паслаў паклікаць да сябе Лію і Рахіль, і сказаў ім: "Бачу па твары бацькі вашага, што ён для мяне не такі, як быў раней. Вы самі добра ведаеце, што я ўсёй душой служыў бацьку вашаму. Але бацька ваш ашукоўваў мяне і дзесяць раз мяняў заплату маю; але Бог не даў яму скрыўдзіць мяне. Бо калі ён сказаў: "тракатыя авечкі будуць тваёй заплатай", усе авечкі радзіліся стракатымі; калі ж сказаў: "Белыя будуць тваёй заплатаю", авечкі радзіліся белымі. І такім чынам Бог забраў дабытак ад бацькі вашага і даў яго мне. Бо калі прыходзіў час параваньня, я бачыў у сьне: усе

(казлы і бараны, якія пакрывалі коз і авечак, былі стракатыя, з плямкамі і латамі. І тады анёл Гасподні сказаў мне ў сьне: "Якубі" А я адгукнуўся:"Я тут!" Тады ён кажа: "Падымі вочы і глянь: усе казлы і бараны, што пакрываюць авечак і коз, стракатыя, з плямкамі і латамі. Я бачыў, як паступае Лабан з табою. : Я — Бог з Бэтелю, дзе ты памазаў стоўп, і даў мне абяцаньне. Цяпер устань і выйдзі з гэтай краіны, і вярніся на тваю бацькаўшчыну" Тады Рахіль і Лія сказалі яму ў адказ: "Ці ж ёсьць яшчэ для нас нейкая частка ў доме бацькі нашагаЬ Ён паступіў з намі, як з чужымі, бо ня толькі ўзяў за нас заплату, але яшчэ і нашу маёмасьць сабе на карысьць абярнуў. Усё багацьце, якое Бог забраў ад бацькі нашага, належыць нам і дзецям нашым. Дык ты рабі, што загадаў табе Бог"

*Пракімен (Пс 111).* Міласэрны, шчодры і справядлівы.
Шчасьлівы чалавек, які баіцца Госпада.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** (*21:3-21*)

Паступаць сумленна і справядліва — мілей Госпаду за кроў ахвяраў. Горды погляд і бунтарнае сэрца — грунт для граху нязбожных. Намеры працавітага прыносяць карысьць; сквапныя зазнаюць бяды. Прыдбаньне скарбаў хлусьлівым языком — пустая марнасьць, што вядзе да сьмерці. Насільле злых іх саміх загубіць, бо яны адмовіліся паступаць справядліва. Крывая дарога злачынцы; нявінны паступае праведна. Лепш жыць у куце пад страхою, чым у супольнай хаце з сварлівай жонкаю. Душа грэшніка жадае зла: у ягоных вачох і прыяцель не знаходзіць ласкі. Калі караюць насьмешніка, прасьцяк робіцца разумным; калі навучаюць мудрага, ён прымае навуку. Праведны (Бог) назірае за домам злачынцы: злых Ён кідае ў няшчасьце. Хто затыкае вушы на крык беднага, сам будзе крычаць без выніку. Тайны дарунак суцішае гнеў, а злосьць лютую — падарак за пазухай. Чыніць справядлівасьць — праведным радасьць, а ліхім жах. Хто збіваецца з дарогі разважнасьці, будзе спачываць у таварыстве ценяў. Хто любіць віно і аліву, той не разбагацее. Нязбожны будзе выкупам для справядлівага. Лепш жыць у пустыні, чым з сварлівай і злоснай жонкаю. Дарагі скарб і аліва ў доме разуманага, але дурань змарнуе іх. Хто шукае міласэрнасьці і справядлівасьці, знойдзе жыцьцё і павагу.

**Вершапесьні**

*(Тон 1).* Апранутая ў багатканую ўладарную пурпуру і ўпрыгожаная нятленнасьцю, душа мая, ты ўсю дастойнасьць сваю апаганіла, страціла багацьце і радасьць, учыніўшы грэх і пагардзіўшы бліжнім тваім, быццам багаты Лазарам; але, каб не папасьці разам

з ім у месца мукаў, зьбяднеей духам і Госпаду, які стаўся бедным дзеля цябе, усклікні: "Ты, што перад расьпяць-цем быў апрануты ў ганебную пурпуру, і на крыжы голы быў расьпяты дзеля мяне, апрані мяне ў вопратку Валадарства Твайго, і ад сораму вечнага збаў мяне, Хрысьце" (*Двойчы*)

Добрая купля ваша, сьвятыя, бо даўшы вашу кроў, вы сталіся насьледнікамі нябесных дабротаў і, дачасна пацярпеўшы, атрымалі вечную радасьць. Сапраўды добрая ваша купля, бо, пакінуўшы тленнае, вы атрымалі ўзамен нятленнае і, цешачыся разам з анёламі, безустанку славіце Тройцу адзінасутную.

*Крыжабагародзічны.* "Меч прабіў, Сыне мой, сэрца маё, — Дзева казала, бачачы на дрэве павешанага Хрыста, — як прадказаў праведны Сямён; але, малю Цябе, Несьмяротны, уваскрэсьні і ўслаў Маці і слугу Тваю".

## СЕРАДА ШОСТАГА ТЫДНЯ ВЯЛІКАГА ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..":**

*(Тон 5).* Багаты грэшнымі пажаданьнямі, апрануты ў вопратку крывадушнасьці, я цешуся ў непаўстрыманасьці і паказваю празмерную неміласэрнасьць, пагарджаючы маім розумам, лежачы перад дзьвярамі пакаяньня, адчуваючы голад дабра, і хварэючы безуважнасьцю. Але Ты, Госпадзе, учыні мяне падобным да Лазара, бедным грахамі, каб у час патрэбы мне не апынуцца ў нязгасным агні з высахлым языком, ня могучы атрымаць пальца памочанага ў вадзе; але пасялі мяне ва ўлоньні Абрагама ў чалавекалюбстве Тваім.

У бязьмежнай любові вы, сьвятыя мучанікі, не адракліся Хрыста: пацярпеўшы розныя мукі і раны, вы перамаглі дзёрзкасьць мучыцеляў і, захаваўшы чыстай і непашкоджанай веру, пераставіліся да неба. Цяпер, маючы ласку ў Бога, прасіце Яго дараваць нам веліч зьмілаваньня.

Ходзячы па тым баку Ярдану, Ты, Ісусе, казаў тым, што былі з Табою: "Прыяцель мой Лазар ўжо памёр і сёньня аддаецца на пахаваньне; цешуся за вас, прыяцелі мае, бо вы ўбачыце, што Я, хоць і аб'явіўся вам як чалавек, ведаю ўсё, будучы нязьменным Богам. Ідзем ажывіць яго, каб сьмерць пачула нашу перамогу і яе поўнае зьнішчэньне. Я ўна раблю гэта, даруючы сьвету веліч зьмілаваньня"

Будзем пераймальнікамі Марты і Марыі, пашлем да Госпада боскія ўчынкі быццам малітвы, каб Ён, прыйшоўшы, уваскрасіў наш розум, які ляжыць без чуцьця мёртвы ў магіле ленасьці, не адчуваючы страху Гасподняга, ня маючы ўчынкаў, што вядуць да жыцьця. Усклікнем Яму: "Глянь на нас, Госпадзе і, як некалі прыяцеля Твайго Лазара, прыйшоўшы, ажывіў, так цяпер ажыві ўсіх нас, даруючы нам веліч зьмілаваньня"

*(Тон 6).* Лазар, які ўжо два дні ляжыць у магіле, бачыць страшныя рэчы: незьлічонае мноства памёрлых ад пачатку сьвету, палоненае путамі пякельнымі. Сваякі плачуць горка, гледзячы на ягоную магілу. А Хрыстос ідзе ажывіць прыяцеля свайго, і ўстанавіць зноў суладзьдзе. Блаславёны Ты, Збавіцелю, слава Табе.

*Тры песьні і багародзічны з мінэі.*

*Пракімен (Пс 114).* Буду рабіць прыемнае Госпаду ў краіне жывых.

Люблю Госпада, які пачуў голас малітвы маёй.

**Чытаньне кнігі Быцьця** *(43:26-31; 45:1-16)*

Браты Язэпа прынесьлі ў дом яго дары, якія мелі з сабю і, трымаючы іх у руках, пакланіліся яму. А ён, спытаўшыся іх аб здароўі, сказаў: "Ці бацька ваш стары, аб якім вы мне гаварылі, здаровы? Ці жыве ён яшчэ?" Яны адказалі: "Здаровы слуга твой, наш бацька", і, схіліўшы галовы, пакланіліся да зямлі. А ён падняўшы вочы, убачыў Беніямінма, сына маці сваёй, і пытае: "Ці гэта ваш наймалодшы брат, аб якім вы мне гаварылі?" І дадаў: "Хай Бог будзе спагадлівы табе, сыне мой!" Потым хутка выйшаў, бо від брата свайго моцна ўсхваляваў яго і сьлёзы паплылі з ягоных вачэй; ён пайшоў у сьвятліцу і там заплакаў. І, памыўшы твар, выйшаў зноў, стараючыся панаваць над сабою. (45). І, не могучы стрымаць свайго хваляваньня перад усімі, сказаў: "Хай усе выйдуць". А калі ўжо нікога не было, ён даў сябе пазнаць братом сваім. Заплакаўшы голасна, так што чулі яго егіпцяне і хатнія фараона, ён сказаў братом сваім: "Я Язэп! Ці бацька мой жывы яшчэ?" Браты яго не маглі нічога адказаць, бо вельмі спалохаліся. Але ён сказаў ім: "Хадзіце бліжэй". Калі яны падышлі бліжэй, ён кажа ім зноў: "Я Язэп, брат ваш; я той, якога вы прадалі ў Ягіпет. Але не сумуйце цяпер і не дакарайце сябе, што прадалі мяне. Бо каб зьберагчы вас пры жыцьці, Бог паслаў мяне сюды перад вамі. Вось ужо два гады трывае голад у той краіне, а яшчэ пяць гадоў ня будзе ні воркі ні жніва. Бог паслаў мяне перад вамі, каб зьберагчы на зямлі рэшту вас і ўратаваць жыцьцё ваша. Дык не вы мяне сюды паслалі, а Бог. Ён зрабіў мяне дарадчыкам фараона,

распарадчыкам у ягоным доме і начальнікам над усім Ягіптам. Ідзіце хутка да майго бацькі і скажыце яму: 'Бог зрабіў мяне начальнікам усяго Ягіпту. Прыхадзі безадкладна, будзеш жыць на зямлі Гошэн, будзеш блізка мяне, ты і твае сыны, унукі, статкі, і ўвесь твой набытак. Я буду карміць цябе, бо голад будзе яшчэ трываць пяць гадоў' Вось вы бачыце на ўласныя вочы, і Бэніямін, брат ваш, бачыць, што гэта я гавару да вас. Раскажыце бацьку майму аб высокай маёй годнасьці ў Ягіпце і аб усім, што бачылі. І, не адкладаючы, прывядзіце да мяне майго бацьку". Пасьля гэтага кінуўся на шыю Бэніяміну, брату свайму, і расплакаўся. Бэніямін таксама плакаў, абдымаючы шыю яго. І плакаў Язэп, абдымаючы і цалуючы братоў сваіх. А потым браты размаўлялі з ім. І разышлася вестка ў палацы фараона, што прыйшлі браты Язэпа.

*Пракімен (Пс 115).* Малітвы мае Госпаду прынясу перад усімі людзьмі Яго.

Веру, таму і гавару: я вельмі прыгнечаны.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** *(21:23-22:4)*

Хто сьцеражэ вусны свае і язык, ахоўвае жыцьцё ад суму. Нахабны зазнайка — блюзьнерца імя яму, — паступае з надменнай пыхлівасьцю. Жаданьні лянівага сьмерць для яго, бо рукі ня хочуць працаваць. Скнара кожны дзень жадае нечага хціва; праведнік мілуе і дае, не шкадуючы. Ахвяра нязбожных агідная, тым больш калі прыносіцца з благім намерам. Хлусьлівы сьведка згіне; той, хто ўмее слухаць, умее і гаварыць. Несумленны мае самаўпэўнены выгляд; праведны зважае на свае ўчынкі. Няма мудрасьці ні розуму, ні добрай рады супроць Госпада. Каня сядлаюць на дзень бітвы, але перамога залежыць ад Госпада. (22). Добрае імя лепшае за багацьце; добрая слава даражэйшая за золата і серабро. Багаты і бедны сустракаюцца: абодвух стварыў Госпад. Разважны бачыць зло і хаваецца; недасьведчаныя ідуць і пападаюць у бяду. Плод пакоры — страх Гасподні, багацьце, пашана і жыцьцё

## ЧАЦЬВЕР ШОСТАГА ТЫДНЯ ПОСТУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 4).* Двух апосталаў, якія пазналі Цябе, Хрысьце, як аднаго з Тройцы, пасылаеш сёньня прывесьці асьляня, як напісана, каб, упакорыўшыся і сеўшы на яго, Добрасардэчны, дабравольна, падрыхтаваць усім, што любяць Цябе і клічуць "Гасанна", месца

на вышынях, і вызваліць ад пажаданьняў, якімі мы ўпадобніліся да неразумных жывёл.

Прымай, Сыёне, Уладара Твайго, што ў Табе ў пакоры зьявіўся, уваскрасіўшы Лазара і разбурыўшы сьмерці горкае валадарства. Усё мноства верных зьбярыцеся, каб з вербамі сустрэць Хрыста, клічучы: "Блаславёны той, хто прыходзіць збавіць род людзкі мукаю крыжоваю, і дараваць усім у дабраце сваёй несьмяротнасьцы!"

*(Тон 8).* Ты, Хрысьце, якога на вышынях носяць сэрафімы як Бога і Тварца, ідзеш сесьці на асля тут на зямлі, упадобніўўшыся нам чалавечым выглядам. Бэтанія весяліцца, сустрэўшы Цябе, Збавіцелю; Ізраіль радуецца, рыхтуючыся прыняць Цябе; сьмерць умярцьвілася, пачуўшы, як Лазар устаў з мёртвых,і мы з вербамі ідучы на сустрэчу радасьці, славім веліч дабраты Тваёй.

*Тры песьні і крыжабагародзічны з мінэі.*

*Пракімен (Пс 119).* Госпада ў час суму клікаў я, і Ён пачуў мяне.
Госпадзе, выбаў мяне ад вуснаў крывадушных і ад лісьлівага языка.

**Чытаньне кнігі Быцьця** *(46:1-7)*

Ізраіль устаў і пайшоў у дарогу разам з усім сваім дабыткам і, прыйшоўшы ў Баршэбу, прынёс ахвяру Богу бацькі свайго Ісаака. А ўночы Бог зьявіўся яму ў відзеньні і сказаў: "Якубе, Якубе!" А той адгукнуўся: "Я тут!". І сказаў яму (Бог): "Я — Бог бацькі Твайго. Ня бойся ісьці ў Ягіпет, бо там Я ўчыню цябе вялікім народам. Я пайду з табою і выведу цябе адтуль, а Язэп зачыніць табе вочы" І пайшоў Якуб з Баршэбы. Сыны Ізраіля пасадзілі бацьку свайго Якуба, сваіх дзяцей і жонак на вазах, якія прыслаў фараон. Узялі таксама свае статкі і ўвесь дабытак, які набылі ў Ханаане. Так прыйшоў Якуб у Ягіпет, ён і ўсе хатнія яго. З ім былі ўсе сыны і сыны сыноў яго, дочкі і дочкі дачок яго: усё патомства сваё ён прывёў з сабою ў Ягіпет.

*Пракімен (Пс 120).* Хай Госпад захавае цябе ад усяго благога, хай Госпад захавае душу тваю.
Я ўзнёс вочы мае на горы: адкуль прыйдзе помач мая.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** *(23:15-24:5)*

Сыне мой! Калі сэрца тваё мудрае, то і маё серца будзе цешыцца; і маё нутро будзе весяліцца, калі вусны твае будуць казаць тое, што належыць. Хай сэрца тваё не зайздросьціць грэш-

нікам, але будзь увесь час у страху Гаподнім; бо будучыня напэўна існуе, і твая надзея ня будзе марнай. Слухай, сыне, будзь мудры, накіроўвай сэрца тваё на правы шлях. Не прабывай у таварыстве тых, што напіваюцца віном, ані сярод тых, што аб'ядаюцца мясам; бо п'яніцы і абжоры зьбяднеюць; а санлівасьць апранае іх у лахманы. Слухай бацьку, які нарадзіў цябе; не зьневажай маці старэнькай. Набывай праўду і не прадавай яе — мудрасьць, разважнасьць, устрымлівасьць. Бацька праведнага будзе цешыцца; і хто нарадзіў мудрага, будзе з яго рады. Няхай радуюцца бацька твой і маці; хай цешыцца тая, што цябе нарадзіла. Дай мне, сыне, сэрца тваё; вочы твае хай дарог маіх пільнуюць; бо блудніца — гэта глыбокая яма, вузкая крыніца — чужая жонка: яна засаду робіць як разбойнік, і памнажае сярод людзей лік няверных. У каго "Вой!", у каго "Ай-ай-ай!", у каго сварка, у каго жалі? У каго раны без прычыны? У каго вочы чырвоныя? У тых, што пры віне заседжваюцца; у тых, што ходзяць каштаваць віно духмянае. Не прыглядайся да віна, якое яно чырвонае, як прыгожа сьвеціцца ў чашы, як лагодна льецца ў горла, бо ўканцы яно кусае, як гадзюка, труціць як зьмяя. Дзіўныя рэчы будуць табе бачыцца, сэрца тваё будзе гаварыць дурніцы і будзеш быццам той, што дрэмле на дне мора, або як той, што на самым вярху мачты: "Білі мяне, але мне не балела; таўклі мяне і я не знаў. Калі ж прачнуся, буду шукаць зноў таго самага". (24). Не зайздросьць благім людзям, не шукай іх таварыства; бо сэрца іх мяркуе пра насільле, вусны іх гавораць злосныя рэчы. Дом будуецца мудрасьцю і ўзмацняецца розумам. Разважнасьць напаўняе каморы ўсякім дарагім і прыгожым дабром. Мудры чалавек моцны; муж вучоны павялічвае сілу сваю.

**Вершапесьні**

*(Тон 8).* Выбаў мяне, Хрысьце Божа, ад падабенства неміласэрнаму багачу, і ад лютага нораву: зрабі мяне перармальнікам удзячнай цярплівасьці Лазара, і не адлучы ад улоньня Абрагама, у вялікай міласэрнасьці Тваёй. *(Двойчы)*

Мучанікі Гасподнія, вы кожнае месца асьвячаеце і ўсякую немач аздараўляеце, дык молім вас: "Маліцеся, каб ад варожых напасьцяў вызваліцца душам нашым".

*Крыжабагародзічны.* "Што за вялікі цуд! Што за страшная новая тайна, — Дзева, бачачы на крыжы паміж двух разбойнікаў павешагна Цябе, якога Яна ў цудоўны спосаб нарадзіла без болю, сказала з плачам. — Гора мне, Дзіця маё любае! Як гэта люты няўдзячны народ прыбіў Цябе да крыжа?"

## ПЯТНІЦА ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 8*). Закончыўшы душакарысны саракадзённы пост, просім Цябе, Чалавекалюбча, дай нам бачыць тыдзень Мукаў Тваіх, каб нам славіць веліч Тваю і невыказны провід, суладна сьпяваючы: "Госпадзе, слава Табе!" (*Двойчы*)

Мучанікі Гасподнія, просім вас, маліце Бога нашага і выпрасіце душам нашым багацьце дабротаў і ачышчэньне ад шматлікіх правін.

(*Тон 6*). Хочучы бачыць магілу Лазара — бо Ты ж сам меўся хутка дабравольна пасяліцца ў магіле, — Ты спытаўся: "Дзе яго палажылі". І пачуўшы ў адказ тое, што было ўжо ведамае Табе, Ты загадаў таму, каго Ты любіў: "Лазар, выйдзі вон!" І Лазар, які ляжаў без жыцьця, паслухаў Цябе, Збавіцеля душ нашых, які даў яму жыцьцё.

Ты, Госпадзе, Коласе жыцьця, прыйшоў на магілу Лазара, які ляжаў мёртвы ўжо чацьверты дзень і, заплакаўшы, зноў яго ажывіў. Такім чынам загадам Тваім сьмерць была зьвязаная, а пахавальныя палотны разьвязаныя, і мноства вучняў напоўілася радасьцю, і аднадушна ўсе яны ўславілі Цябе, усклікаючы: "Блаславёны Ты, Збавіцелю, зьмілуйся над намі!"

Голас Твой, Госпадзе, разбурыў сьмерці ўладу, і магутнае слова Тваё ўзьняло з магілы чатырохдзённага мёртвага; і Лазар стаўся першым плодам збавеннага новага жыцьця. Усё магчыма Табе, Госпадзе і ўладрау ўсіх, дык даруй слугам Тваім ачышчэньне і веліч зьмілаваньня.

Хочучы ўпэўніць вучняў Тваіх у Тваім уваскрасеньні, Ты, Госпадзе, прыйшоў на магілу Лазара і паклікаў яго; і вось пекла было палоненае, і адпусьціла чатырохдзённага мёртвага, які ўсклікнуў Табе: "Блаславёны Ты, Госпадзе; слава Табе!".

Узяўшы вучняў Тваіх, Ты, Госпадзе, прыйшоў у Бэтанію, каб Лазара ўваскрасіць. Заплакаўшы над магілаю, згодна з людзкой прыродаю,Ты як Бог уваскрасіў яго, хоць ён ужо чатыры дні мётрвы быў. І ён усклікнуў Табе, Збавіцелю: "Блаславёны Ты, Госпадзе, слава Табе!"

Слава ...

(*Тон 8*). Стаўшы перад магілай Лазара і паклікаўшы мёртвага, Ты, Збавіцелю, узьняў яго быццам ад сну. І вось ён абтрос тлен-

насьць зваротам нятленнасьці, і выйшаў, спавіты ў пахавальныя палотны на загад слова Твайго. Ты, Чалавекалюбча, можаш усё і ўсе людзі служаць Табе, і ўсё слухаецца Цябе: Збавіцелю наш, слава Табе!

Цяпер...

(*Тон 8*). Скончыўшы саракадзённы душакарысны пост, усклікнем: Радуйся, горад Бэтанія, бацькаўшчына Лазара; радуйцеся, Марта і Марыя, сёстры яго: заўтра вось прыходзіць Хрыстос, словам ажывіць памёрлага брата. Пачуўшы голас Яго, ненасытнае пекла, задрыжаўшы ў страху і голасна застагнаўшы, вупусьціла Лазара, абвязанага палотнамі. Убачыўшы гэты цуд, грамада гэбрэяў зьдзівіўшыся, з вербамі і галінкамі дрэў выйдзе насустрач Яму, і дзеткі — хоць бацькі іх напоўняцца злоснай зайздрасьцю,— будуць славіць Яго і клікаць: "Блаславёны той, хто ідзе ў імя Господняе, Уладар Ізраіля!"

*Пракімен (Пс.124).* Помач наша ў імя Госпада, які стварыў неба і зямлю.

Той, хто жыве ў Ерусаліме, не пахісьнецца давеку.

**Чытаньне кнігі Быцьця** *(49:33-50:26)*

Калі Якуб скончыў даваць наказы сынам сваім, ён лёг на пасьцель і, аддаўшы духа, адышоў да сваіх продкаў. Язэп прыпаў да цела бацькі свайго і, заплакаўшы, цалаваў яго. А пасьля загадаў Язэп слугам сваім, лекарам, забальсамаваць бацьку ягонага; і яны забальсамавалі Ізраіля. Сорак дзён пайшло на тое, каб яго забальсамаваць; і жыхары Ягіпту плакалі па ім семдзесят дзён. Калі ж мінулі дні жалобы, зьвярнуўся Язэп да вяльможаў фараонавых з просьбай: "Калі я знайшоў ласку ў вас, скажыце аба мне фараону, кажучы: Перад сьмерцю бацька мой абавязаў мяне прысягай, кажучы: пахавай мяне ў магіле, якую я прыгатаваў сабе ў зямлі Ханаанскай. Дык цяпер пайду пахаваць бацьку майго, а пасьля вярнуся". Далажылі фараону просьбу Язэпаву. І кажа фараон Язэпу: "Ідзі і пахавай бацьку твайго, так як ты кляўся." І Язэп пайшоў пахаваць бацьку свайго, а з ім пайшлі слугі фараона, старэйшыя ўрадоўцы дому яго і начальнікі зямлі ягіпецкае, а таксама ўся сям'я Язэпа, браты яго, і ўсе хатнія бацькі ягонага. Толькі дзеці, авечкі і статкі жывёлы засталіся ў зямлі Гашэн. Ехалі з ім таксама людзі на конях і калясьніцах, творачы вялікую сьвіту. Прыйшоўшы на зямлю Горан-Гатаад па той бок Ярдану, яны наладзілі вялікае і ўрачыстае пахаваньне бацьку свайму. Абрад пахаваньня трываў сем дзён. Жыхары ханаанскай зямлі бачылі жалобныя абрады ў Горан-Атаад і казалі: "Вялікая

жалоба ў егіпцянаў". Дзеля гэтага мясцовасьць па той бок Ярдану атрымала назву "Плач егіпцянаў". Такім чынам сыны (Якуба) ўчынілі, як ім загадаў бацька: прынесьлі (цела) яго ў Ханаан і пахавалі ў пячоры ў полі Макпель, якое купіў Абрагам ад Эфрона Хетыта для пахаваньня памёрлых. Яно было недалёка ад Мамбрэ.

Пасьля пахаваньня бацькі Язэп вярнуўся ў Ягіпет, а з ім браты ягоныя і ўсе, што пайшлі разам з ім, каб пахаваць ягонага бацьку. Браты ягоныя, здаючы сабе справу з таго, што бацька іх ужо не жыве, думалі: "Напэўна Язэп узьненавідзіць нас і будзе мсьціцца за крыўду, якую мы яму ўчынілі." І паслалі яны сказаць Язэпу: "Бацька твой перад сьмерцю даў такі наказ: Скажыце Язэпу: Адпусьці братом тваім іх віну і грэх, бо яны ўчынілі крыўду табе. Але ты цяпер прабач з ласкі тваёй слугам Бога бацькі твайго." Язэп, калі яму гэта сказалі, расплакаўся. Тады прыйшлі да яго браты і, упаўшы перад ім, сказалі: "Вось мы слугі твае." Але Язэп сказаў ім: "Ня бойцеся, бо не я кірую, але Бог. Вы некалі задумалі зло супроць мяне, але Бог абярнуў усё на дабро, каб зрабіць так, як ёсьць сёньня: збавіць жыцьцё многім людзям. Дык ня бойцеся: я пракармлю вас і дзяцей вашых." І так ён пацешыў іх і гутарыў з імі сардэчна.

І жыў Язэп у Ягіпце, ён і сям'я бацькі яго. Дажыў ён да ста дзесяці гадоў, дачакаўся праўнукаў з Яфрэма. Таксама дзеці Махіра і Манасіі нарадзіліся пры жыцьці Язэпа. Наканец Язэп сказаў братом сваім: "Я паміраю, але Бог напэўна пакажа вам сваю спагадлівасьць і выведзе вас з гэтай краіны ў зямлю, якую ўрачыста абяцаў даць Абрагаму, Ісааку і Якубу." Пасьля гэтага ўзяў Язэп у сыноў Ізраіля наступнае абяцаньне: "Калі Бог наведае вас, забярыце з сабою мае косьці". І памёр Язэп, маючы сто дзесяць гадоў, а яны забальсамавалі ягонае цела і палажылі ў дамавіну ў Ягіпце.

*Пракімен (Пс.124).* Тыя, што спадзяюцца на Госпада, быццам гара Сыён, не пахіснуцца давеку.

Госпад ня дасьць, каб жэзл нязбожных кіраваў лёсам праведных.

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў** *( 31:8-31)*

Адчыняй вусны твае за нямых, у абароне годных спагады. Судзі праведна, чыні справядлівасьць беднаму і ўбогаму.

Хто знойдзе дабрадзейную жонку? цана ёй вышэй за пэрлы. Сэрца мужа ўпэўненае ў ёй, і ён не застаецца без здабытку. Яна чыніць яму дабро, а ня зло, праз усе дні жыцьця яго. Дастае воўну і лён, ахвотна працуе рукамі сваімі. Быццам купецкі карабель, здалёку здабывае ежу. Устае яшчэ ноччу, раздае ежу ў доме сваім, а слугам абавязкі. Думае аб зямлі, купляе яе; рукамі сваімі

садзіць вінаграднік; падпярэзвае сілаю паясьніцу сваю, узмацняе рукі свае. Бачная карысьць з працы яе: ліхтар яе ня гасьне сярод ночы. Працягвае рукі да кужалю, пальцы яе бяруць верацяно. Адчыняе далонь убогаму, руку сваю падае таму, хто ў патрэбе. Сям'я яе не баіцца сьцюжы, бо ўся сям'я апранута ў падвойную (цёплую) вопратку. Яна тчэ кілімы; вопратка яе - бісер і пурпура. Муж яе вядомы ў варотах, калі сядзе разам са старэйшымі краіны. Яна тчэ палатно, прадае яго, паясы дастаўляе купцу. Годнасьць і краса - вопратка яе, весела глядзіць яна ў будучыню. Мудрасьць адчыняе яе вусны, лагоднае навучаньне на языку ў яе. Яна наглядае за гаспадаркай у доме сваім, не спажывае хлеба ленасьці. Дзеці ўстаюць і бласлаўляюць яе, і муж хваліць яе: "Многа жанчын працавітых, але ты перавышаеш іх усіх!" Прыга-жосьць зманлівая і краса пераходная: жонка багабойная годная пахвалы. Дайце ёй ад плоду рук яе: хай праслаўляюць усе ўчынкі яе ў варотах.

*Літургія Раней асьвячаных Дароў.*

## СУБОТА ЛАЗАРА

### ЛІТУРГІЯ

*Трапар (тон 1).* Хочучы перад Тваёй мукай запэўніць нас у агульным уваскрасеньні, Ты, Хрысьце Божа, узьняў з мёртвых Лазара. Дзеля гэтага мы, як калісь дзеці, носячы знакі перамогі, Табе, Пераможцы сьмерці, радасна ўсклікаем: "Гасанна на вышынях, блаславёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе!"

*Кандак (тон 2).* Хрыстос — радасьць усіх, праўда, сьвятло, жыцьцё і ўваскрасеньне сьвету, ў сваёй дабраце зьявіўся тым, што на зямлі, і, стаўшыся вобразам уваскрасеньня, дараваў адпушчэньне ўсім.

*Замест "Сьвяты Божа...":* Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціляся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

*Пракімен (Пс 26:1).* Госпад — сьвятло і збаўленьне маё: каго мне баяцца?

Госпад — абарона жыцьця майго: перад кім мне дрыжаць?

*Апостал.* Гэб. 12:28-13:8

*Алілуя (Пс 92:1).* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу; апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Ён умацаваў сусьвет, што **не зварухнецца.**

*Евангельле:* Ян: 11:1-45

*Задастойнік.* Слаўна ўшануем, верныя, Багародзіцу, якая агонь Боства ва ўлоньні прыняла, астаўшыся неапаленай; дык у несьціханых песьнях узьвялічым яе.

*Прычасьнік.* З вуснаў дзяцей і немаўлят Ты ўчыніў сабе хвалу. Алілуя, алілуя алілуя. (Пс.8:3)

# ВЕРБНІЦА

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 6).* Сёньня сабрала нас ласка Духа Сьвятога і мы, узяўшы крыж, усклікаем: Блаславёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе, гасанна на вышынях. *(Двойчы)*

Той, хто мае за пасад неба, і за падножак зямлю, Сын спрадвечны і Слова Бога Айца, сёньня, прыйшоўшы ў Бэтанію, панізіўся, сеўшы на бяздумнае асьля. Таму і дзеткі гэбрэйскія, узяўшы ў рукі вербныя галінкі, голасна ўславілі Яго, клічучы: Гасанна на вышынях, блаславёны Той, хто прыходзіць, Уладар Ізраільскі.

Прыйдзем сёньня і мы, увесь новы Ізраіль, царква ўсіх народаў і ўсклікнем разам з прарокам Захарам: Радуйся, дачка Сыёну, абвяшчай на ўвесь сьвет, дачка Ерусаліму, што вось ідзе да цябе ўладар твой, ласкавы і збавенны, седзячы на асьляці, сыне пад'ярэмнай. Сьвяткуй разам з дзеткамі, трымаючы ў руках галінкі, і ўсклікай: Гасанна на вышынях, блаславёны той, хто прыходзіць, Уладар Ізраільскі.

Хочучы даць нам вобраз сьвятога ўваскрасеньня Твайго, Ты загадаў устаць памёрламу прыяцелю Твайму Лазару, які ўжо чацьвёрты дзень ляжаў без дыханьня ў магіле і пачаў сьмярдзець. Пасьля Ты, Збавіцелю, сеў на асьля, быццам на калясьніцу, каб здабыць сабе ўсе народы. Дзеля гэтага Твой уміласваны Ізраіль, вуснамі немаўлят і нявінных дзетак, аддаў славу Табе, бачачы, як Ты, шэсьць дзён перад Пасхаю, увайшоў у горад сьвяты.

Шэсьць дзён перад Пасхаю прыйшоў Ісус у Бэтанію і прыступілі да Яго вучні Ягоныя, пытаючыся: Госпадзе, дзе хочаш , каб мы падрыхтавалі Табе есьці ПасхуЬ І Ён паслаў іх, кажучы: Ідзіце ў суседнюю вёску і ўбачыце там чалавека, які нясе збан вады; ідзіце за ім і скажыце гаспадару дому: Настаўнік кажа — хачу ў цябе есьці Пасху з вучнямі маімі.

Слава ...: *(Тон 6).* Сёньня сабрала нас...*(Гл. вышэй)*

Цяпер ...: Сёньня сабрала нас... *(Гл. вышэй)*

*Пракімен нядзельны.*

**Чытаньне кнігі Быцьця (*49: 1-2;8-12*)**

Якуб сабраў сыноў сваіх, кажучы: 'Зьбярыцеся разам, каб я мог вам сказаць, што вас чакае ў будучыні. Зьбярыцеся і слухайце, сыны Якуба. Слухайце Ізраіля, бацьку вашага. Юда, цябе славіць будуць браты твае, бо рука твая на шыі ворагаў тваіх. Сыны бацькі твайго будуць кланяцца табе. Юда, сыне мой, быццам малады леў, ты ад здабычы ўзьнімаешся. Быццам леў ён заснуў, або быццам львіца: хто асьмеліцца абудзіць яго? Скіпетр ня будзе адняты ад Юды, ні жэзл спаміж ног ягоных, пакуль не зьявіцца той, да каго ён належыць і знойдзе паслушэнства сярод народаў. Ён прывяжа асла свайго ля вінаградніка, сына асьліцы да найлепшага вінаграднага куста. У віне вымые ён вопратку сваю, у соку вінаградным — адзеньне сваё. Поўныя радасьці будуць вочы яго ад віна, і зубы яго больш белыя за малако.

**Чытаньне кнігі прарока Сафонія (*3:14-19*)**

Так кажа Госпад: "Радуйся, дачка Сыёну, сьвяткуй, Ізраіль, цешся ад усяго сэрца, дачка Ерусаліму; Госпад адмяніў прысуд твой, разагнаў ворагаў тваіх. Госпад, Уладар Ізраільскі, сярод цябе: ужо больш ня ўбачыш гора. У той дзень скажуць Ерусаліму: Ня бойся, і Сыёну: Хай не аслабеюць рукі твае. Госпад, Бог Твой сярод цябе, Усемагутны збавіць цябе. Ён радасьць прынясе табе, абновіць цябе ў любові сваёй, будзе цешыцца і радавацца ў табе, быццам у сьвята. Тых, што наракаюць, і нездаволеных забяру ад цябе: хай яны ня будуць для цябе цяжарам. Праганю тады ўсіх прыгнятальнікаў тваіх, падтрымаю тых, што спатыкнуліся, зьбяру зноў расьцярушаных; учыню ім хвалу, і будуць слаўнымі па ўсёй зямлі".

**Чытаньне кнігі прарока Захара (*9:9-15*)**

Радуйся, дачка Сыёну, весела ўсклікай, дачка Ерусаліму! Вось Уладар твой ідзе да цябе, справядлівы і пераможны. Ён ціхманы: едзе на асьляці — на асьляці, сыне пад'ярэмнай. Ён сатрэ ў порах калясьніцы ў Яфрэме, і коней у Ерусаліме; разаб'е на кускі лукі, абвесьціць супакой людзям. Ён пашырыць уладаньне сваё ад мора да мора, ад берагоў ракі аж да канцоў зямлі."З увагі на кроў саюзу, што Я з табою заключыў, Я вызвалю вязьняў тваіх з ямы бязводнай. Вернуцца да цябе, дачка Сыёну, выгнаньцы надзеі. Запэўніваю цябе сёньня, што узнагароджу цябе падвойна. Бо трымаю Юду ў гатоўнасьці, нацягваю лук Яфрэма; накіроўваю сыноў тваіх, Сыёне, быццам кап'ё супроць сыноў Явана; зраблю цябе мячом уладара". Госпад зьявіцца ім, быццам маланкі паляцяць Яго стрэлы; заграе ў трубу Госпад, Уладар усемагутны, прыйдзе ў шуме паўдзённага ветру. Госпад сіл будзе іх ахоўваць.

**Ліцьця**

(*тон 1*). Дух Сьвяты, які навучыў апосталаў гаварыць рознымі мовамі, загадвае нявінным дзеткам Ізраільскім клікаць: "Гасанна на вышынях, блаславёны той, хто прыходзіць, Цар Ізраільскі".

Спрадвечны Сын і Слова Айца, сеўшы на бяздумнае жарабя, прыходзіць сёньня ў Ерусалім. Дзеткі з галінкамі ў руках аддаюць хвалу Таму, на каго херувімы са страхам зірнуць ня сьмеюць, пяючы: Гасанна вышынях, гасанна Сыну Давідаваму, што прыходзіць вызваліць ад спакусы род наш.

Шэсьць дзён перад Пасхаю, голас Твой, Госпадзе, быў чутны ў глыбіні апраметнай, калі Ты ўзьняў чатырохдзённага Лазара; дзеткі ж гэбрэйскія ўсклікнулі: Гасанна, Божа наш, слава Табе.

(*Тон 2*). Ты, Госпадзе, ідучы на мукі, каб споўніць закон і прароцтвы, уехаў у сьвяты горад, седзячы на жарабяці; дзеткі ж гэбрэйскія, прадвяшчаючы перамогу ўваскрасеньня, сустрэлі Цябе з вербнымі галінкамі, усклікаючы: Блаславёны Ты, Збавіцелю наш, змілуйся над намі.

Слава Табе, Хрысьце, які на вышынях сядзіш на пасадзе, і якога мы сёньня чакаем разам з крыжам Тваім. Цешыцца дачка Сыёну, і ўсе народы зямлі поўняцца радасьцю; дзеткі трымаюць галінкі ў руках і вучні падсьцілаюць вопраткі свае, і ўвесь бачны сьвет усклікае: Блаславёны Ты, Збавіцелю, зьмілуйся над намі.

Слава ... цяпер...

(*Тон 3*). Шэсьць дзён перад Пасхаю прыйшоў Ісус у Бэтанію, каб вярнуць да жыцьця памёршага чатырохдзённага Лазара і абвясьціць уваскрасеньне. Сустрэлі Яго жанчыны Марыя і Марта, сёстры Лазара, кажучы: Госпадзе, калі б Ты быў тут, не памёр бы брат наш. Тады Ён кажа ім: Не памёр брат ваш; ці ж не прадсказаў Я вам, што той, хто верыць у Мяне, хоць і памрэ, жыць будзеЬ Пакажыце мне, дзе яго пахавалі". І крыкнуў моцным голасам Тварэц усіх: "Лазар, выйдзі вон!".

**Вершапесьні**

(*Тон 8*). Радуйся і цешся, Сыён, красуйся і весяліся, Божая Царква, бо вось Уладар твой ідзе ў справядлівасьці, седзячы на жарабяці, і прымаючы хвалу ад дзетак, якія ўсклікаюць: Гасанна на вышынях, Блаславёны Ты, крыніца міласэрнасьці: зьмілуйся над намі.

*Верш:* З вуснаў дзетак і немаўлят Ты ўчыніў сабе хвалу.

Прыходзіць сёньня Збавіцель у Ерузалім, каб выпаўніць напісанае аб Ім, і ўсе, узяўшы ў рукі вербныя галінкі, вопраткі свае падсьцілаюць Яму, ведаючы, што Ён Бог наш, якога безупынку славяць херувімы, усклікаючы: Гасанна на вышынях, блаславёны Ты, крыніца вялікай міласэрнасьці, зьмілуйся над намі.

*Верш.* Госпадзе, Госпадзе наш, як цудоўнае імя Тваё па ўсёй зямлі.

Ты, Ласкавы Госпадзе, якога носяць херувімы і серафімы славяць, сёньня, як Давід, сеў на жарабя, і дзеткі аддалі Табе хвалу, належную Богу, а гэбрэі нязбожна абмаўлялі Цябе; Твой уезд на жарабяці прадвяшчаў навярненьне ад бязверства да веры ўсіх народаў. Слава Табе, Хрысьце, адзіны міласэрны і чалавекалюбны.

Слава ... цяпер...

*(Тон 6).* Сёньня сабрала нас ласка **Духа Сьвятога і мы, узяўшы** крыж, усклікаем: "Блаславёны Той, **хто прыходзіць у імя Гасподняе**, гасанна на вышынях".

**Адпушчальныя трапары**

*(Тон 1).* Хочучы перад мукаю Тваёю ўпэўніць нас у агульным уваскрасеньні, Ты, Хрысьце Божа, узьняў з мёртвых Лазара. Дзеля гэтага мы, як некалі дзеці, носячы знакі перамогі, Табе, Пераможцы сьмерці, радасна ўсклікаем: Гасанна на вышынях, блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. (Двойчы).

*(Тон 4).* Будучы пахаванымі з Табою ў хрышчэньні, мы ўдастоіліся вечнага жыцьця ва ўваскрасеньні Тваім, Хрысьце Божа наш, і таму сёньня прыносім Табе песьню хвалы: Гасанна на вышынях, блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе.

## ЛІТУРГІЯ

Першы антыфан (*Пс. 114:1,2,3,5*)

**Чытальнік:** Люблю Госпада, бо Ён пачуў голас малітвы маёй.

**Людзі:** Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас. (*Так пасьля наступных вершаў*)

**Чытальнік:** Ён прыхіліў вуха сваё да мяне ў дзень, калі я паклікаў Яго.

—Боль сьмяротны агарнў мяне, сеці пякельныя апуталі мяне.

— Сум і гора апанавалі мяне, і я паклікаў імя Гасподняе.

— Слава Айцу і Сыну, і Сьвятому Дух цяпер, і заўсёды, і на векі вякоў. Амін.

**Людзі:** Малітвамі Багародзіцы ...

Другі антыфан (*Пс. 115:1,2,4,5*)

**Чытальнік:** Я быў непахісны ў веры, нават калі казаў: "Я вельмі нешчасьлівы".

**Людзі:** Сыне Божы, што ўсеўся на жарабяці, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя. (Так пасьля кожнага наступнага верша)

**Чытальнік:** Што дам Госпаду ўзамен за ўсё, што Ён даў мне.

— Чашу збаўленьня прыму і імя Гасподняе паклічу.

— Выканаю абяцаньні мае Госпаду перад усім народам Яговым.

**Людзі:** Сыне Божы...
Слава... цяпер....
Адзінародны Сыне ....

Трэці антыфан (*Пс. 117: 1,2,3,4*)

**Чытальнік:** Аддайце падзяку Госпаду, бо Ён добры, бо міласэрнасьць Яго давеку.

**Людзі:** (*Тон 1*). Хочучы перад мукаю Тваёю ўпэўніць нас у агульным уваскрасеньні, Ты, Хрысьце Божа, узьняў з мёртвых Лазара. Дзеля гэтага мы, як некалі дзеці, носячы знакі перамогі, Табе, Пераможцы сьмерці, радасна ўсклікаем: Гасанна на вышы-

нях, блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. (Так пасьля кожнага наступнага верша)

**Чытальнік:** Хай скажа дом Ізраіля, што Ён добры, што міласэрнасьць Яго давеку.

— Хай скажа дом Аарона, што Ён добры, што міласэрнась Яго давеку.

— Хай скажуць усе, што баяцца Бога, што Ён добры, што міласэрнасьць Яго давеку.

**Людзі:** Хочучы перад мукаю...

**Дыякан:** Мудрасьць, устаньце!

**Сьвятар:** Блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе. Госпад — Бог, і Ён зьявіўся нам.

**Людзі:** Сыне Божы, што ўсеўся на жарабяці, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

*Трапар першы (тон 1):* Хочучы перад мукаю... (Гл. вышэй)

Слава...

*Трапар другі (Тон 4):* Будучы пахаванымі з Табою ў хрышчэньні, мы ўдастоіліся вечнага жыцьця ва ўваскрасеньні Тваім, Хрысьце Божа наш, і таму сёньня прыносім Табе песьню хвалы: Гасанна на вышынях, блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе.

Цяпер...

*Кандак (Тон 6).* Хрысьце Божа, што сядзіш на пасадзе ў нябёсах, на зямлі, сеўшы на жарабя, Ты прыймаеш хваленьне анёлаў і песьні дзетак, якія ўсклікаюць Табе: Гасанна на вышынях, бласла-вёны той, хто прыходзіць Адама паклікаць.

*Пракімен (Пс 117: 26,1).* Блаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе.

Аддайце падзяку Госпаду, бо Ён добры, бо міласэрнасьць Яго давеку.

*Апостал:* Флп 4:4-9

*Алілуя (Пс 97:1,3).* Сьпявайце Госпаду песьню новую, бо Ён цуды ўчыніў.

Усе канцы зямлі ўбачылі збаўленьне Бога нашага.

*Евангельле*: Ян 12:1-18

*Задастойнік*:Узьвялічвай, душа мая, Госпада, які сеў на жарабя. Госпад — Бог, і Ён зьявіўся нам: наладзім сьвята і, поўныя радасьці, з вербнымі галінкамі ў руках, пойдзем узьвялічваць Хрыста ў песьнях, усклікаючы: Благаславёны той, хто прыходзіць у імя Гасподняе.

*Прычасьнік*. Благаславёны той, хто прыходзіць у імя Гаспод-няе: Госпад — Бог, і Ён зьявіўся нам. Алілуя, алілуя, алілуя.

## Малітва на асьвячэньне вербаў

Госпадзе, Божа наш, што сядзіш на херувімскім пасадзе, Ты ўзнавіў Тваю ўладу, паслаўшы Сына Твайго Адзінароднага, Госпада нашага Ісуса Хрыста, каб цераз Яго крыж, пахаваньне і ўваскрасеньне збавіць сьвет. Калі Ён прыйшоў у Ерусалім на дабравольную муку, людзі, што былі ў цемры і цені сьмерці, вый-шлі насустрач з галінкамі дрэў і пальмамі, быццам са знакамі перамогі, прадвяшчаючы такім чынам уваскрасеньне. Сёньня, Уладару, мы таксама, трымаючы ў руках вербныя галінкі, як калісь тыя людзі і дзеткі, усклікаем Табе "Гасанна" і хвалім Цябе ў песьнях і гімнах духоўных. Ты ж захавай і сьцеражы нас, як некалі іх, і зрабі нас дастойнымі ўбачыць трохдзённае ўваскра-сеньне ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым, з Якім благаславёны Ты і Твой Усесьвяты , добры і жыцьцядайны Дух цяпер, і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Вербы гэтыя асьвячаюцца і благаслаўляюцца найсьцем Усесьвятога Духа, цераз акрапленьне гэтай сьвятой вадою, у імя Айца, і Сына і Сьвятога Духа. Амін.

## ВЯЧЭРНЯ Ў ВЕРБНІЦУ ВЕЧАРАМ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..":**

*(Тон 8)*. Радуйся і цешся, горад Сыён; красуйся і весяліся, царква Божая, бо вось Уладар Твой прыходзіцзь у справяд-лівасьці, седзячы на жарабяці, і прымаючы хвалу ад дзетак, якія ўсклікаюць: "Гасанна на вышынях, благаславёны Ты, крыніца міласэрнасьці. Зьмілуйся над намі". *(Двойчы)*

Прыходзіць сёньня Збавіцель у Ерусалім, каб выпаўніць напі-санае аб ім, і ўсе, узяўшы ў рукі вербныя галінкі, вопраткі свае падсьцілаюць яму, ведаючы, што Ён Бог наш, якога безупынку

**славяць херувімы, усклікаючы: "Гасанна на вышынях, благаславёны Ты, крыніца міласэрнасьці. Зьмілуйся над намі". (*Двойчы*)**

**Ты, ласкавы Госпадзе, якога носяць хэрувімы і славяць сэрафімы, сёньня, як Давід, сеў на жарабя, і дзеткі аддалі Табе хвалу, належную Богу, а гэбрэі нязбожна абмаўлялі Цябе; Твой уезд на жарабяці прадвяшчаў навярненьне ад бязьверства да веры ўсіх народаў. Слава Табе, Хрысьце Божа, адзіны міласэрны і чалавекалюбны. (*Двойчы*)**

Слава ...: Радуйся і цешся.....

Цяпер...: Ты, ласкавы Госпадзе ...

*Уваход. Пракімен звычайны.*

**Вершапесьні.**

*(Тон 2).* Адсьвяткаваўшы боскае сьвята вербаў і пальмаў, пяройдзем, верныя, да другога — збавеннай тайны пачэсных мукаў Хрыстовых. Глянем, як Ён дабравольна прымае мукі за нас і прынясем Яму дастойныя песьні хвалы, клічучы ад усяго сэрца: "Крыніца міласэрнасьці, прыстанішча збаўленьня, Госпадзе, слава Табе".

*Верш.* Сьпявайце Госпаду новую песьню, бо Ён цуды стварыў.

Страшна трапіць у рукі Бога жывога: Ён — судзьдзя намераў і думак сардэчных. Дык хай ніхто не прыходзіць, каб спакушаць вернасьць Яго беззаганную; але ў пакоры сэрца прыпадзем да Хрыста, каб атрымаць міласэрнасьць і прыняць ласку ў час патрэбы.

*Верш.* Усе канцы зямлі бачылі збаўленьне Бога нашага.

Зборышча нязбожных і вераломных, што не захавалі вы веры Госпаду свайму: чаму захоўваеце запавет, насьледнікамі якога не зьяўляецеся; чаго хваліцеся Айцом, адкінуўшы Сына? Праракаў, якія прадвясьцілі Сына, вы ня прынялі. Пасаромцеся вашых дзетак, якія клічуць: "Гасанна Сыну Давідаваму; благаславёны Той, хто прыходзіць у імя Гасподняе".

Слава ...: Адсьвяткаваўшы ...

Цяпер...: Страшна папасьціся ...

*"Цяпер адпускаеш..." і ўсё далейшае, як у нядзелю Вялікага Посту вечарам.*